Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ВЕРАСНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 179 (27544) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СЛАВА АБ ВЯЛІКІМ ПОДЗВІГУ НЕ САТРЭЦЦА Ў ВЯКАХ

Ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, якія вызвалілі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і ўсім грамадзянам Рэспублікі Беларусь

Дарагія героі-вызваліцелі!
Паважаныя суайчыннікі!

Сардэчна рады павіншаваць вас з 70-й гадавінай пачатку вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Менавіта гэтымі вераснёўскімі днямі сем дзесяцігоддзяў таму Чырвоны сцяг зноў горда ўзняўся над адваяванымі ў гітлераўскіх акупантаў райцэнтрамі Камарын і Хоцімск. Беларускі народ ішоў да вялікага дня больш як два крывавыя і цяжкія гады, аддаючы ўсе сілы барацьбе з ворагам.

Наша зямля першая прыняла на сябе ўдар гітлераўскай армады і здолела даць дастойны адпор захопнікам, паказаўшы, што тут жывуць патрыёты, якія будуць стаяць насмерць за сваю Айчыну.

Ніякія катаванні і пакуты, ніякія зверствы і здзекі фашысцкіх катаў не здолелі зламаць волю нашага народа. Беларусь паказала свету небывалы прыклад дзяржавы-воіна, рэспублікі-партызанкі, жыхары якой ад малога да вялікага бясстрашна змагаліся, лічыўшы, што лепш загінуць, чым стаць рабамі.

Прадзеды, дзяды і бацькі пакляліся не складаць зброю да таго часу, пакуль родная беларуская зямля не будзе вызвалена ад фашыстаў. І цаной бяспрыкладнага гераізму і неймаверных ахвяр яны стрымалі клятву, разам з усімі народамі Савецкага Саюза вызвалілі ад карычневай чумы не толькі Беларусь, але і ўсю Еўропу.

Паважаныя ветэраны! Слава аб вашым вялікім подзвігу, аб цяжкіх, гераічных дарогах вызваліцеляў не сатрэцца ў вяках. І такой жа вечнай будзе наша ўдзячнасць усім жывым і загінулым героям. Нізкі вам паклон! Упэўнены, што ні мы, ні нашы дзеці і ўнукі ніколі не забудзем свяшчэнную праўду аб Вялікай Айчыннай вайне.

Дарагія суайчыннікі! У кожнага пакалення ёсць свая гістарычная місія. Доблесныя франтавікі, партызаны і падпольшчыкі, самаадданыя працаўнікі тылу не толькі прынеслі нам мір і свабоду, але і заклалі той фундамент, на якім выраслі і расквітнела незалежная беларуская дзяржава.

Наш святы абавязак — цвёрда стаяць на варце гэтых заваяванняў, перад тварам любых пагроз і выклікаў часу праяўляць з'яднанасць і адзінства і ні пры якіх умовах не дапусціць страты незалежнасці Айчыны. Толькі так мы зможам захаваць і перадаць нашчадкам вялікі гістарычны здабытак — суверэнную Рэспубліку Беларусь.

Жадаю вам, дарагія сябры, моцнага здароўя, поспехаў, шчасця, працвітання і доўгіх гадоў мірнага жыцця пад чыстым небам любімай Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

СУСТРЭЧЫ, ЯКІЯ ЎМАЦОЎВАЮЦЬ АДЗІНСТВА НАРОДАЎ

Удзельнікам VIII Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў

Паважаныя сябры! Сардэчна вітаю на беларускай зямлі ўдзельнікаў VIII Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў Садружнасці.

За сваю гісторыю Форум стаў значным фактарам развіцця міждзяржаўных адносін у гуманітарнай сферы. Сустрэчы дзеячаў навукі, культуры і адукацыі краін СНД садзейнічаюць умацаванню брацкага адзінства нашых народаў.

У Год экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя, аб'яўлены Садружнасцю Незалежных Дзяржаў, асноўнай тэмай Форуму вызначаны праблемы экалагічнай бяспекі, захавання прыроднага багацця і культурнай спадчыны. Упэўнены, што яго правядзенне паслужыць актыўнаму абмену вопытам і пашырэнню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў гэтых важных напрамках сацыяльнага развіцця сучаснага грамадства.

Жадаю плённай працы Форуму, невычэрпнай энергіі, поспехаў, шчасця і дабрабыту яго ўдзельнікам.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота БЕЛТА.

АДКБ — ГАРАНТ БЯСПЕКІ І СТАБІЛЬНАСЦІ НА ЗНАЧНАЙ ЧАСТЦЫ ЕЎРАЗІЙСКАГА КАНТЫНЕНТА

АДКБ удалося стварыць гібкую сістэму, арыентаваную на многавектарнасць і здольную рэагаваць на новыя выклікі і пагрозы, абапіраючыся, у першую чаргу, на прэвентыўныя меры. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 23 верасня ў Сочы на сесіі Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, гэта як мага лепш адпавядае не толькі інтарэсам усіх дзяржаў-членаў, але і забяспечвае бяспеку, стабільнасць і прадказальнасць на значнай частцы Еўразійскага кантынента. «А гэта ў сучасным свеце дарагога каштуе», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка лічыць жыццёва неабходным развіваць новыя напрамкі дзейнасці АДКБ, у тым ліку і міратворчы складнік.

Паводле яго слоў, цяпер дынамічна развіваюцца такія напрамкі супрацоўніцтва, як забеспячэнне інфармацыйнай і пагранічнай бяспекі, закладваюцца асновы скаардынаванай інфармацыйнай палітыкі дзяржаў — членаў АДКБ.

Прэзідэнт Беларусі з задавальненнем канстатаваў, што гэты год для арганізацыі быў адносна спакойны: ніякіх унутраных узрушэнняў, работа вялася ў штатным рэжыме, што дало магчымасць сканцэнтравацца на вырашэнні штодзённых задач, накіраваных на ўмацаванне і развіццё АДКБ па ўсіх напрамках.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на тое, што прапанаваны расійскім бокам фармат мерапрыемстваў у Сочы дае магчымасць не толькі правесці неабходныя сустрэчы, але і ў спакойнай абстаноўцы абмеркаваць актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня, праблемы бяспекі ў зоне адказнасці арганізацыі і выпрацаваць узгодненыя падыходы па рэагаванні на ўзнікаючыя выклікі і пагрозы.

Прэзідэнт Беларусі лічыць жыццёва важным для бяспекі краін АДКБ аказаць дапамогу Таджыкістану ва ўмацаванні граніцы з Афганістанам. «Усім вядома, што амерыканцы праяўляюць інтарэс да гэтага рэгіёна, і ўсё часцей з'яўляецца інфармацыя аб намеры ЗША і НАТА пакінуць у рэгіёне частку ўзбраення і ваеннай тэхнікі, што знаходзяцца цяпер у Афганістане. Яны нават гатовы фінансаваць будаўніцтва пагранзастаў на таджыкска-афганскай граніцы», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр АРХІПАЎ, начальнік упраўлення дэлімітацыі і дэмаркацыі дзяржаўнай мяжы Дзяржаўнага пагранічнага камітэта:

«Задача сумеснай беларуска-ўкраінскай дэмаркацыйнай камісіі — не толькі правесці дзяржаўную мяжу і расставіць памежныя знакі, але таксама стварыць максімальна камфортныя ўмовы, каб гэты працэс негатыўна не адбіўся на мясцовым насельніцтве, якое там жыве. Праблемныя пытанні бываюць звязаны з пражываннем і вядзеннем гаспадарчай або іншай дзейнасці паблізу дзяржаўнай мяжы. Бываюць выпадкі, калі людзі прывыклі хадзіць па пэўнай сцежцы, скарачаючы адлегласць паміж населенымі пунктамі. І ніхто не задумваўся, што гэтая сцежка праходзіць па тэрыторыі сумежнай дзяржавы. У сувязі з гэтым намі будзе праводзіцца адпаведная работа».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.09.2013 г.

Долар ЗША	9040,00	▲
Еўра	12230,00	▲
Рас. руб.	283,50	▼
Укр. грыўня	1105,95	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 13°
Віцебск	+ 12°
Гомель	+ 12°
Гродна	+ 12°
Магілёў	+ 12°
Мінск	+ 10°

СУПРАЦОЎНІЦТВА — НА ПЕРСПЕКТЫВУ

Сёння ў Мінску пачынае працу VIII Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД

VIII ФОРУМ ТВОРЧАЙ І НАВУКОВАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ ДЗЯРЖАЎ – УДЗЕЛЬНІЦ СНД

2013 год – Год экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя ў дзяржавах – удзельніцах СНД

23—26 верасня

Праекты ў галіне гуманітарнага, культурнага і інфармацыйнага супрацоўніцтва самым цесным чынам аб'ядноўваюць, звязваюць краіны СНД трывалымі стасункамі. Невыпадкова і тое, што чарговай пляцоўкай для дыскусій, дыялогу на розныя актуальныя тэмы супрацоўніцтва стаў Мінск. Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег Праляскоўскі ўзначальвае Раду па гуманітарным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД. Беларусь у апошні час рэалізавала многія сумесныя з іншымі краінамі ініцыятывы, з'яўляецца рухавіком шматлікіх навуковых і творчых праектаў.

У час работы форуму асаблівая ўвага будзе нададзена тэматычнай панэлі «СМІ ў сучасных грамадска-палітычных працэсах». Пра асаблівасці развіцця журналістыкі ва ўмовах глабальнага грамадства, вартасці балансу дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў у дзейнасці СМІ, сацыяльную адказнасць журналістыкі будуць весці размову многія аўтарытэтныя кіраўнікі газет і часопісаў, тэлеканалаў розных краін. Сярод гасцей, удзельнікаў дыскусій — першы намеснік генеральнага дырэктара ІТАР-ТАСС Міхаіл Гусман, віцэ-прэзідэнт Расійскай акадэміі навук, рэктар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава Віктар Садаўнічы, казахскі паэт, кінадраматург Бахытжан Канап'янаў, старшыня Беларускага Саюза журналістаў, галоўны рэдактар газеты «Рэспубліка» Анатоль Лемяшонак... Мадэратарам выступіць галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия» Павел Якубовіч.

Іншыя тэматычныя секцыі форуму — «Экалагічная адукацыя і выхаванне», «Рэалізацыя моладзевай палітыкі ў краінах Садружнасці», «Біялагічная і ландшафтная разнастайнасць: сучасны стан, ахова і рацыянальнае выкарыстанне», «Роля найноўшых тэхналогій у лячэнні дзіцячых анкалагічных захворванняў», «Дыялог культур і гуманітарнае супрацоўніцтва краін СНД: гістарычны вопыт, інтэграцыйныя рашэнні», «Захаванне прыроднай і культурнай спадчыны. Вопыт кіравання культурнымі ландшафтамі і іншымі аб'ектамі культурнай спадчыны на ахоўных тэрыторыях». Таксама пройдзе пасяджэнне Рады Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў, адбудуцца іншыя сустрэчы і дыскусіі.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

VIII Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД 23 верасня стартаваў праектам «Мінск сустракае гасцей». Дэлегаты форуму ўсклалі кветкі да абеліска на плошчы Перамогі.

Фота БЕЛТА.

■ Соцыум

ЯК ПАДТРЫМАЦЬ МАЛАДОГА СПЕЦЫЯЛІСТА?

У якім памеры выплачваюцца пад'ёмныя маладым спецыялістам? Як вырашаецца пытанне замацавання маладых спецыялістаў на месцах у сельскіх рэгіёнах? Чаму некаторыя маладыя спецыялісты атрымліваюць матэрыяльную дапамогу ад прадпрыемстваў за арэнду жылля, а іншыя — не? На гэтыя і іншыя пытанні можна было пачуць адказы падчас анлайн-канферэнцыі, якая прайшла на сайтах Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і БЕЛТА.

У ёй прынялі ўдзел **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ігар СТАРАВОЙТАЎ** і спецыялісты юрыдычнага ўпраўлення, галоўнага ўпраўлення працы і заработнай платы Мінпрацы і сацабароны.

— Ці плануецца падтрымаць маладых педагогаў і медыкаў, як гэта робіцца з маладымі спецыялістамі АПК (маецца на ўвазе Указ Прэзідэнта Беларусі ад 12.08.2013 г. № 353)? Можа, такі падыход дапаможа вырашыць кадравую праблему ў гэтых відах дзейнасці?

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Кіраўніком дзяржавы і ўрадам робяцца захады, накіраваныя на стымуляванне працы і матэрыяльную падтрымку маладых спецыялістаў. Павышэнне ўзроўню аплаты іх працы ажыццяўляецца як у рамках рашэнняў, накіраваных на павелічэнне заработнай платы ўсіх работнікаў арганізацый, так і шляхам прыняцця асобных актаў заканадаўства, дзеянне якіх распаўсюджваецца толькі на маладых спецыялістаў.

Асноўнымі такімі рашэннямі з'яўляюцца:

❍павышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду, якая зацвярджаецца ўрадам для аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы;

❍павышэнне тарыфных ставак (акладаў) ад 10 да 50 працэнтаў (у сярэднім гэта павышэнне складзе ад 17 да 85 долараў) на розных пастаўках (маладым спецыялістам; з першага дня работы за стаж працы па спецыяльнасці (галіны); пры рабоце па кантракце; за акадэмічную ступень магістра; тым, хто завяршылі навучанне ў вядучых ВНУ краіны з адзнакай і г.д.);

СТАР. 2

■ Надвор'е

ЦЫКЛОН ПРЫНЁС ДАЖДЖЫ І ХОЛАД

Гэтымі днямі моцны цыклон, які ўзнік над Балтыйскім морам, рухаецца ў бок Маскоўскай вобласці. Таму сёння тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў яго тыльнай халоднай часткі, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

У аўторак паўсюдна будуць ісці дажджы, усталюецца моцны паўночна-заходні вецер парывамі да 15-20 м/с. Пахаладае. Максімальная тэмпература паветра ўдзень — 8-14 цяпла. У сераду і чацвер паступленне халоднага паветра з боку поўначы Еўропы працягнецца. У сераду ўначы месцамі, а ўдзень паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У чацвер невялікія ападкі прагназуюцца толькі ў асобных раёнах Беларусі. Стане яшчэ халадней, калі тэмпература паветра ўначы на сераду знізіцца да плюс 1-7 градусаў, а ўначы на чацвер чакаюцца ў асобных раёнах нават замаразкі да 0 — мінус 3 градусаў. Удзень 25-26 верасня — ад 6 да 13 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, даволі холадна будзе і ў апошнія дні тыдня. З пятніцы і да нядзелі ўключна месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы толькі плюс 1-6 градусаў, а на глебе і месцамі ў паветры замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Удзень прагназуецца ў межах 6-13 цяпла. Сіноптыкі падлічылі, што такі тэмпературны фон прыкладна на 3-5 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму апошняй дэкады верасня.

Сяргей КУРКАЧ

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАРТЫЯ АНГЕЛЫ МЕРКЕЛЬ ПЕРАМАГЛА НА ВЫБАРАХ

Канцлер Германіі Ангела Меркель і яе Хрысціянска-дэмакратычны саюз (ХДС) зноў атрымалі большасць у парламенце, паведамляюць інфармагенцтвы. За ХДС аддалі галасы каля 42% выбаршчыкаў. Гэта самы лепшы паказчык партыі на выбарах з 1990 года. Уся Германія гаворыць пра «зорны час» Ангелы Меркель. ХДС традыцыйна выступае ў саюзе з Хрысціянска-сацыяльным саюзам. Перамога блока ХДС/ХСС аўтаматычна азначае перамогу яго кандыдата ў барацьбе за пасаду канцлера, і хоць афіцыйнае прызначэнне Ангелы Меркель адбудзецца пазней, гэта стане простай фармальнасцю.

ІРАН І РАСІЯ ДАМОВІЛІСЯ АБ БУДАЎНІЦТВЕ НОВЫХ АЭС

Іран і Расія будуць супрацоўнічаць у сферы будаўніцтва новых АЭС. «На апошнім пасяджэнні міжурадавай камісіі Ірана і Расіі па эканамічных пытаннях бакі прыйшлі да пагаднення аб будаўніцтве новых АЭС» , — заявіў кіраўнік Арганізацыі па атамнай энергіі Ірана Алі Акбар Салехі. Учора ў Іране быў падпісаны пратакол перадачы Бушэрскай АЭС іранскім спецыялістам, згодна з якім на працягу двух гадоў на яе будзе распаўсюджвацца гарантыя расійскага боку. АЭС «Бушэр» з'яўляецца першай АЭС не толькі ў Іране, але і на ўсім Блізкім Усходзе.

БОЛЬШ ЗА 53 ЧАЛАВЕКІ ЗАГІНУЛІ ПРЫ ВЫБУХУ КАЛЯ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ЦАРКВЫ

Выбух каля хрысціянскай царквы на паўночным захадзе Пакістана забраў жыцці 53 чалавек, больш за 80 былі паранены, паведамляюць інфармагенцтвы. Двое тэрарыстаў-смяротнікаў 22 верасня прывялі ў дзеянне выбуховыя прылады каля царквы ў горадзе Пешавар, калі вернікі пачалі пакідаць яе пасля нядзельнай службы. У момант тэракту ў царкве знаходзілася каля 600 чалавек. Хрысціяне складаюць каля 4% насельніцтва Пакістана.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЗМЯНЕННЕ ВАГІ ПРЫЗНАНА НЕБЯСПЕЧНЫМ

Універсітэт Агаё ўстанавіў: калі чалавек набраў вагу пасля 50 гадоў і яна застаецца стабільнай, ён мае ўсе шанцы захаваць сабе жыццё ў наступныя 16 гадоў, піша The Daily Mail.

Атрымліваецца, падтрыманне стабільнай вагі — самае важнае. У асаблівай небяспецы знаходзяцца людзі з лішняй вагой, якія працягваюць набіраць кілаграмы.

Спецыялісты даследавалі прыкладна 10 тыс. чалавек, ацэньваючы іх індэкс масы цела. Ніжэй за іншых рызыка смерці была ў людзей з індэксам 25-29,9, якія захоўвалі яго. За імі ішлі людзі з індэксам 30-34,9, якія перайшлі з разраду «лішняя вага» ў катэгорыю «атлусценне». На трэцім месцы размясціліся людзі з першапачаткова нармальнай вагой, якія потым яе набралі. І на апошнім — асобы з атлусценнем першага тыпу, якія яшчэ больш папаўнелі. Характэрна: да іх статыстычна набліжалася група людзей першапачаткова з нармальнай вагой, якія потым пачалі худнець, і група людзей з самым цяжкім атлусценнем (індэкс 35 і вышэй).

КАРОТКА

Кошт 1 кв.м на першасным рынку жылой нерухомай маёмасці Мінска з пачатку 2013 года павялічыўся на 16,5 працэнта. Сярэдняя цана 1 кв.м у сталічных новабудоўлях у пачатку верасня 2013 года склала $1640. У новабудоўлях эканом-класа кошт удзелу ў долевым будаўніцтве вырас на 20,7 працэнта, бізнес-класа — на 14,7 працэнта, эліт — на 11,2 працэнта.

Учора пачаўся другі этап сумеснага стратэгічнага вучэння ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2013».

Адміністрацыйныя будынкі органаў унутраных спраў, злучэнняў і воінскіх часцей унутраных войскаў МУС Беларусі аб'яўляюцца свабоднымі ад курэння зонамі, а супрацоўнікам міліцыі і ваеннаслужачым унутраных войскаў забараняецца курэнне ў форменным адзенні, прадугледжана загадам МУС № 424.

Выканкам УЕФА ўключыў Мінск у спіс кандыдатаў на правядзенне матчаў Еўра-2020.

■ Ведай сваіх!

ПАШТАЛЬЁН І АПЕРАТАР — ПРАФЕСІІ ПРЭСТЫЖНЫЯ!

Днямі на базе адпачынку «Дружба» адбыўся чарговы (ужо 17-ы) рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства сярод паштальёнаў і аператараў сувязі. Як і варта было чакаць, з'ехаліся на яго лепшыя з лепшых — гэта значыць, пераможцы аналагічных раёных і абласных конкурсаў, каб абмяняцца досведам, каб паказаць сябе. Менавіта гэтага патрабавала, прынамсі, хатняе заданне.

Першая частка яго — «Мы — твар кампаніі» — дэманстравалася адразу пасля прывітальных слоў **старшыні прафсаюза работнікаў сувязі Ніны ГАЎРЫЛАВАЙ і генеральнага дырэктара РУП «Беларпошта» Ірыны САКСОНАВАЙ.**

— Нельга нават параўнаць узровень патрабаванняў, якія прад'яўляліся раней да паштальёнаў і аператараў, з тымі, што прад'яўляюцца цяпер. Калі 10 гадоў таму мы ладзілі конкурс прафесійнага майстэрства, то для гэтага ці не машынамі завозілі рэквізіт — фанерныя скрынкі для ўпакоўкі пасылак, сургуч, шпагат... Ды што там — раней для гарадскіх і сельскіх аператараў сувязі нават конкурсы былі асобныя, — падкрэсліла Ірына Ігнатаўна. — Сёння і ўзровень ведаў, і патрабаванні, і пералік паслуг ужо аднолькавыя. І ўсе яны звязаны з найноўшымі тэхналогіямі і аўтаматызацыяй працэсаў, з выкарыстаннем камп'ютараў.

Што, у прыватнасці, і дэманстравалі каманды, выконваючы другую частку хатняга задання «Мая прафесія — прэстыжная!».

СТАР. 4

Самы яркі прафесійны дэбют — пераможца конкурсу паштальёнаў АПС-2 Барысава Таццяна АЛЬШАННІКАВА.

ISSN 1990 - 763X

АДКБ — ГАРАНТ БЯСПЕКІ І СТАБІЛЬНАСЦІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Але бясплатна нічога не бывае. Не выключана, што за свае паслугі яны папросяць штосьці ўзамен. Ці выгадна гэта саюзнікам па АДКБ, мы сёння павінны абмеркаваць і вызначыцца. Сумняваюся, што выгадна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Улічваючы існуючую абстаноўку, Прэзідэнт Беларусі лічыць, што цяжкасці Таджыкістана з'яўляюцца актуальным пытаннем АДКБ на гэтым этапе. «Праблемы, якія зыходзяць з тэрыторыі Афганістана, транснацыянальныя і ў выпадку нашай бяздзейнасці будуць нарастаць, як снежны камяк. Таму нам жыццёва важна для ўласнай бяспекі аказаць дапамогу Таджыкістану», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што магчымасць аказання падтрымкі Таджыкістану ў апошнія гады абмяркоўвалася не раз на розных узроўнях. У прыватнасці, Беларусь прыняла рашэнне бясплатна абучаць таджыкскіх афіцэраў у Ваеннай акадэміі.

«Але менавіта цяпер мы ўшчыльную падышлі да неабходнасці зрабіць рашучыя захады па прадухіленні гэтай пагрозы. Менавіта гэтага чакаюць нашы саюзнікі», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Толькі агульнымі намаганнямі і з належным узроўнем каардынацыі нам удасца максімальна эфектыўна аказаць садзейнічанне саюзніку, які мае патрэбу ў рэальнай дапамозе», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што Беларусь дзейнічае ў адзіным ключы з Расіяй і іншымі краінамі АДКБ па сірыйскай праблеме. «Па Сірыі, іншых праблемах мы дзейнічаем у адзіным ключы з Расіяй, нашым асноўным стратэгічным партнёрам, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — У нас няма абсалютна ніякіх рознагалоссяў, таксама як і няма абсалютна ніякіх рознагалоссяў і з членамі АДКБ. Мы заўсёды будзем прытрымлівацца нашых гарантый і абяцанняў і будзем дзейнічаць у адзіным ключы з членамі АДКБ».

Паводле слоў беларускага лідара, абмеркаванню міжнароднай праблематыкі напярэдадні з падачы Прэзідэнта Расіі было прысвечана шмат часу.

У Сочы Прэзідэнт Беларусі таксама правёў сустрэчу са сваім арменскім калегам Сержам Саргсянам. «Ёсць адна тэма, якую мы павінны абмеркаваць, — гэта перспектывы ўступлення Арменіі ў Мытны саюз, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Я скажу адназначна: калі Арменія вырашыць дзвюма нагамі ўступіць у нашу арганізацыю, то Беларусь ніколі не будзе гэтаму перашкаджаць, а будзе толькі падтрымліваць вашы імкненні і ўсяляк дапамагаць, каб хутчэй завяршыліся ўсе працэдуры і вы далучыліся да нас».

Паводле слоў Прэзідэнта Арменіі, намеры ў гэтым пытанні вельмі сур'ёзныя. «Мы не перадумалі, таму што самі прыйшлі да гэтага меркавання».

Ацэньваючы ў цэлым стан двухбаковых адносін, Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што ў апошнія гады яны ўзняліся на вельмі высокі ўзровень. Беларускі лідар выказаў задавальненне цяперашнім станам супрацоўніцтва і яго перспектывамі.

Серж Саргсян у сваю чаргу адзначыў ажыўленне двухбаковых адносін. «Усе дамоўленасці выконваюцца, гэта відаць па тавараабароце і ўсіх напрамках нашага супрацоўніцтва», — сказаў ён.

■ Саюзная дзяржава

У СМАЛЕНСКУ МОЖА З'ЯВІЦЦА ЦЭНТР ПРЫГРАНІЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота ў суботу, на заключным пасяджэнні аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзення святкавання 1150-годдзя Смаленска, адзначыў выключную ролю горада на Дняпры ва ўзаемадзеянні дзвюх краін.

«Ключ» ад Саюза

Рыгор Рапота выступіў з ініцыятывай стварыць у горадзе рэгіянальны цэнтр прыгранічнага супрацоўніцтва. «Смаленск — ключавы горад на стыку інтарэсаў Беларусі і Расіі, — падкрэсліў дзяржсакратар. — Значнасць горада відавочная. Я не буду казаць пра гістарычныя і геаграфічныя аспекты. Вялікае значэнне мае эканамічнае супрацоўніцтва. І значэнне Смаленска для эканомікі дзвюх краін расце. Па-першае, тут праходзіць лепшая магістраль, якая яднае Мінск і Маскву. А гэта найлепшыя транспартна-лагістычныя магчымасці. Дастаткова сказаць, што праз Смаленск ідзе каля 30% усіх аўтамабільных грузаў у Расійскую Федэрацыю. Менавіта гэты фактар трэба ў будучыні развіваць і ўдасканальваць».

Дарэчы, Рыгор Рапота раней ужо выступаў з прапановай зрабіць у Смаленску цэнтр прыгранічнага супрацоўніцтва дзвюх краін. «Я і надалей буду на гэтым настойваць, — кажа палітык. — Калі стваралася Саюзная дзяржава, Смаленск разглядаўся як месца для штаб-кватэры выканаўчых органаў Саюза, але ўлады Расіі і Беларусі распарадзіліся па-іншаму. Аднак значнасць Смаленска для двухбаковых кантактаў ніколькі не зменшылася».

Горад у выгадным становішчы

Эканамічнае ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і Смаленскай вобласцю праяўляецца, напрыклад, у тым, што тут працуе вялікая колькасць беларускіх будаўнікоў і іншых спецыялістаў. Губернатар вобласці Аляксей Астроўскі гэта пацвярджае: «Значную частку нагрузкі па рэканструкцыі і рамонце фасадаў горада ўзялі на сябе менавіта беларускія будаўнікі. Мы ўдзячныя Беларусі за гэту дапамогу».

Акрамя таго, «рыхтуецца да адкрыцця расійска-беларускі найбуйнейшы мясакамбінат «Сафонава». Гэта таксама паказчык паспяховага развіцця двухбаковых адносін менавіта тут, на смаленскай тэрыторыі», — лічыць Рыгор Рапота. У тым жа рэчышчы разважае Дзмітрый Казак, намеснік старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі: «Смаленск знаходзіцца ў вельмі выгадным геаграфічным становішчы, на перакрыжаванні многіх шляхоў, што дазваляе развіваць тут практычна любыя вытворчасці. Эканамічны патэнцыял вялікі. Тут жывуць выдатныя, працавітыя людзі. Перспектыву мае і прамысловасць, і сельская гаспадарка, бо ў рэгіёне вельмі спрыяльны для гэтага клімат. Будзе мець поспех развіццё транспартнай лагістыкі». Таму віцэ-прэм'ер прапанаваў губернатару Смаленскай вобласці распрацаваць і ўнесці на разгляд урада прапанову аб стварэнні цэнтра прыгранічнага супрацоўніцтва.

Функцыі змяніліся

Ужо падчас выступу перад гараджанамі Рыгор Рапота сказаў, што «для тых, хто жыве ў Расіі і Беларусі, ды і на ўсёй постсавецкай прасторы, Смаленск заўсёды асацыяваўся з паняццем «горад-крэпасць». А значыць — з мужнасцю, бесперапыннай вайной. Так і было ў далёкай і не вельмі далёкай гісторыі. Сёння ўсё змянілася. І функцыі Смаленска таксама змяняюцца. Для Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі асноўнай задачай з'яўляецца стварэнне такіх умоў, каб расіяне ў Беларусі і беларусы ў Расіі не адчувалі сябе замежнікамі. Памежны горад для вырашэння гэтай задачы мае вялікае значэнне. Развіццё Смаленска ва ўсіх сферах — адзін з фактараў умацоўвання нашых адносін».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ,
г. Смаленск

■

Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні намесніку генеральнага дырэктара ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Людміле Генадзьеўне Кавалёвай у сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю МАЦІ.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Грахоўскай Валерыі Валянцінаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

ЯК ПАДТРЫМАЦЬ МАЛАДОГА СПЕЦЫЯЛІСТА?

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

❍ усталяванне штомесячных даплат (у памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду — 260 тыс. рублёў). Гэты захад прадугледжаны для педагагічных работнікаў, медыцынскіх работнікаў з вышэйшай медыцынскай (фармацэўтычнай) адукацыяй, а таксама для работнікаў, якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць у сферы фізічнай культуры і спорту.

— Якія катэгорыі моладзі змогуць пайсці на альтэрнатыўную службу? Ці будуць яны атрымліваць зарплату? На якім этапе адпаведны законапраект?

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб альтэрнатыўнай службе» будзе ўнесены Саветам Міністраў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у кастрычніку 2013 года. У далейшым рашэнне аб абмеркаванні праекта Закона будзе прымацца пры разглядзе яго парламентам.

— Ці плануецца змяняць працягласць водпуску выпускнікам, якія працуюць па размеркаванні?

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Калі гаворка ідзе аб працоўным водпуску маладога спецыяліста, то яго працягласць вызначаецца заканадаўствам аб працы, у прыватнасці, арт. 155 Працоўнага кодэкса (асноўны адпачынак складае не менш за 24 каляндарныя дні). Права на дадатковыя водпускі работнік таксама мае ў адпаведнасці з заканадаўствам аб працы, якое залежыць ад віду заключанага працоўнага дагавора (кантракта), ад умоў працы (шкодныя і (або) небяспечныя), работы ў рэжыме ненармаванага працоўнага дня і іншых абставін.

— Якія памеры грашовай дапамогі маладым спецыялістам, якія крыніцы яе фінансавання? Ці рыхтуюцца змяненні ў гэтай сферы?

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Маладым спецыялістам выплачваецца грашовая дапамога ў памеры месячнай стыпендыі, прызначанай ім у апошнім перад выпускам семестры (паўгоддзі). Гэты захад прадугледжаны для педагагічных работнікаў, медыцынскіх работнікаў з вышэйшай медыцынскай (фармацэўтычнай) адукацыяй, а таксама для работнікаў, якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць у сферы фізічнай культуры і спорту.

— Якія катэгорыі моладзі змогуць пайсці на альтэрнатыўную службу? Ці будуць яны атрымліваць зарплату? На якім этапе адпаведны законапраект?

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб альтэрнатыўнай службе» будзе ўнесены Саветам Міністраў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у кастрычніку 2013 года. У далейшым рашэнне аб абмеркаванні праекта Закона будзе прымацца пры разглядзе яго парламентам.

— Ці плануецца змяняць працягласць водпуску выпускнікам, якія працуюць па размеркаванні?

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Калі гаворка ідзе аб працоўным водпуску маладога спецыяліста, то яго працягласць вызначаецца заканадаўствам аб працы, у прыватнасці, арт. 155 Працоўнага кодэкса (асноўны адпачынак складае не менш за 24 каляндарныя дні). Права на дадатковыя водпускі работнік таксама мае ў адпаведнасці з заканадаўствам аб працы, якое залежыць ад віду заключанага працоўнага дагавора (кантракта), ад умоў працы (шкодныя і (або) небяспечныя), работы ў рэжыме ненармаванага працоўнага дня і іншых абставін.

— Якія памеры грашовай дапамогі маладым спецыялістам, якія крыніцы яе фінансавання? Ці рыхтуюцца змяненні ў гэтай сферы?

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Маладым спецыялістам выплачваецца грашовая дапамога ў памеры месячнай стыпендыі, прызначанай ім у апошнім перад выпускам семестры (паўгоддзі). Гэты захад прадугледжаны для педагагічных работнікаў, медыцынскіх работнікаў з вышэйшай медыцынскай (фармацэўтычнай) адукацыяй, а таксама для работнікаў, якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць у сферы фізічнай культуры і спорту.

— Законам Рэспублікі Беларусь ад 29.12.2012 г. «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» вызначана, што жанчынам, за якіх, а таксама якімі абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне выплачваліся менш чым за 6 месяцаў да ўзнікнення права на дапамогу па цяжарнасці і родах, гэтая дапамога прызначаецца ў мінімальным памеры. Гэта 50% БПМ кожнага месяца водпуску па цяжарнасці і родах. Атрымліваецца, што маладыя спецыялісты пазбаўляюцца значнай грашовай сумы.... Ці будуць унесены змяненні з улікам існуючай дэмаграфічнай сітуацыі?

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Норма аб вылічэнні дапамогі па цяжарнасці і родах у мінімальным памеры асобам, за якіх абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне выплачваліся менш чым за 6 месяцаў да наступлення часовай непрацаздольнасці, адпавядае палажэнням арт. 8 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнага сацыяльнага страхавання».

У адпаведнасці з гэтым артыкулам права на выплаты па дзяржаўным сацыяльным страхаванні (да іх залічваецца ўказаная дапамога) набываецца ў залежнасці ад выплаты ўзносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне на адпаведныя страхавыя выпадкі. Умовы прызначэння выплат па дзяржаўным сацыяльным страхаванні могуць уключаць патрабаванні аб мінімальным перыядзе выплаты ўзносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне на адпаведны страхавы выпадак да яго наступлення. Варта адзначыць, што аналагічныя ўмовы прызначэння дапамог са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання шырока прымяняюцца ў сусветнай практыцы.

— Як будзе вырашацца пытанне замацавання маладых спецыялістаў на месцах у сельскіх рэгіёнах? Як будзе гарантавацца, што яны застануцца там на працягу працяглага часу, а не вернуцца ў горад? Ці будуць неабходныя асаблівыя захады для прадухілення адтоку сельскай моладзі ў горад?

Кансультант аддзела працоўнага заканадаўства юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна РАХУБА:

— Кіраўніком дзяржавы прыняты Указ ад 12.08.2013 г. № 353 «Аб некаторых захадах па забеспячэнні арганізацый аграпрамысловага комплексу кадрамі», якім вызначаны штомесячныя даплаты:

1.1. маладым спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, прынятым на працу ў арганізацыі аграпрамысловага комплексу, на працягу двух гадоў з дня заключэння з імі працоўнага дагавора (кантракта) у двухразовым памеры тарыфнай стаўкі першага разраду, з аднясеннем гэтых даплат на затраты па вытворчасці і рэалізацыі тавараў (работ, паслуг), якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні;

1.2. кіраўнікам і спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія адпрацавалі ў арганізацыях аграпрамысловага комплексу два гады па размеркаванні (перараспрэдяленні), накіраванні (наступным накіраванні), якія працягваюць працаваць у названых арганізацыях на ўмовах заключаных кантрактаў, на працягу наступных трох гадоў у трохразовым памеры тарыфнай стаўкі першага разраду за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных на развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рыбагадоўлі і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Распрацоўшчыкам гэтага ўказа з'яўлялася Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Па пытаннях прымянення гэтага ўказа можна звяртацца ў гэтае міністэрства.

— Чаму некаторыя маладыя спецыялісты атрымліваюць матдапамогу ад прадпрыемстваў за арэнду жылля (калі інтэрнат ім не прадастаўляецца), а іншыя — не? Чым гэта рэгламентуецца?

Начальнік юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна МАСЛОЎСКАЯ:

— Згодна з п. 26 пастановы Саўміна ад 22.06.2011 «Аб некаторых пытаннях размеркавання, перараспрэдялення, накіравання на працу, наступнага накіравання на працу выпускнікоў, кампенсацыі затрачаных дзяржавай сродкаў на іх падрыхтоўку і мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў, рабочых, служачых» маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым), а таксама выпускнікам абласныя, Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў, наймальнікі ў адпаведнасці з заканадаўствам могуць вызначаць грашовую дапамогу, выдзяляць сродкі з мэтай кампенсацыі затрат на наём жылых памяшканняў.

Акрамя таго, наймальнікі маюць права вызначаць у калектыўным або працоўным дагаворы (кантракце) выплату кампенсацыі выдаткаў на наём жылых памяшканняў.

— У якім памеры выплачваюцца пад'ёмныя маладым спецыялістам? Па якіх крытэрыях вызначаецца іх памер?

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Выпускнікам, якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання, выплачваецца, у прыватнасці, грашовая дапамога, памер, крыніцы фінансавання і парадак выплаты якой вызначаюцца ўрадам Беларусі.

Маладым спецыялістам, а таксама выпускнікам выплачваецца грашовая дапамога ў памеры месячнай стыпендыі, прызначанай ім у апошнім перад выпускам семестры (паўгоддзі). Маладым рабочым (служачым), якія атрымалі прафесійна-тэхнічную адукацыю, грашовая дапамога выплачваецца з разліку тарыфнай стаўкі па прысвоенай ім кваліфікацыі (разрадзе, класе, катэгорыі) або адпаведнага акладу.

Выплата грашовай дапамогі ажыццяўляецца наймальнікам у месячны тэрмін з дня заключэння працоўнага дагавора (кантракта) з выпускніком у поўным памеры, незалежна ад колькасці выкарыстаных ім дзён адпачынку.

Накіраваным для работы ў якасці педагагічных работнікаў выпускнікам установай адукацыі выплачваецца грашовая дапамога за 45 каляндарных дзён за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў з разліку месячнай стыпендыі, прызначанай ім у апошнім перад выпускам семестры (паўгоддзі), не пазней выдачы пасведчання аб накіраванні на працу.

У выпадку, калі маладыя спецыялісты і выпускнікі не атрымлівалі стыпендыі ў апошнім перад выпускам семестры (паўгоддзі), ім выплачваецца адпаведная грашовая дапамога з разліку сацыяльнай стыпендыі, устаноўленай на дату выпуску.

— Выпускнік накіраваны на працу ў сувязі з размеркаваннем у тую арганізацыю, у якой ён ужо працуе. Ці мае ён права на грашовую кампенсацыю, якая выплачваецца маладым спецыялістам на працягу месяца пасля заключэння працоўнага дагавора (кантракта)?

Таццяна РАХУБА:

— Грашовая дапамога выплачваецца ўсім маладым спецыялістам, незалежна ад таго, працаўладкаваліся яны ў арганізацыю да або пасля размеркавання. Вызначальным з'яўляецца факт размеркавання на працу ў гэтую арганізацыю і прад'яўленне работнікам пасведчання аб накіраванні на працу.

Падрыхтавала
Святлана БУСЬКО

■

БУДЗЕМ БУДАВАЦЬ КЕМПІНГІ...

Канец верасня — той перыяд, калі смела можна падводзіць вынікі турыстычнага сезона. За сем месяцаў Беларусь наведалі 2 млн 150 тыс. турыстаў, а прыбытак ад турыстычных паслуг склаў 132 млн долараў, што на 16,2% больш за мінулы год. Але, па словах намесніка міністра спорту і турызму Чэслава ШУЛЬГІ, турыстычны патэнцыял краіны значна большы.

Фота БЕЛТА.

Тым не менш і зараз аб'ём інвестыцый у турыстычную сферу працягвае расці. У параўнанні з мінулым годам гэтая лічба павялічылася ўдвая і склала 498 млрд. рублёў. Перш за ўсё такая станоўчая дынаміка звязана з прыходам на беларускі рынак брэндавых гасцінічных сетак — Hyatt, Hilton і інш. Адначасова рэалізуецца некалькі сур'ёзных праектаў, сярод якіх, напрыклад, будаўніцтва культурна-этнаграфічнага цэнтра «Наш родны кут Сабалі» ў Брэсцкай вобласці. Пашыраецца спіс унікальных мерапрыемстваў, прывабных для турыстаў. Так, улетку ўпершыню прайшлі сырны фестываль пад Мінскам і вішнёвы фестываль у Глыбокім. Яшчэ раней ужо пяты раз адбыўся «Фэст экскурсаводаў». Сёлета ўдзельнікі фестывалю абсалютна бясплатна маглі азнаёміцца з больш чым 80-цю турыстычнымі маршрутамі. Таксама ў рамках мерапрыемства была праведзена спецыялізаваная экскурсія для людзей з абмежаваннямі па зроку.

Аднак ёсць і пэўныя праблемы. «Вельмі марудна ідзе развіццё месцаў адпачынку для аўтатурыстаў, — адзначыў Чэслаў Шульга. — Вопыт будаўніцтва кемпінга ў Крупскім раёне прадэманстраваў складанасць гэтага працэсу. Трэба ўлічваць мноства экалагічных і санітарных патрабаванняў. А гэта, вядома, адбівае ахвоту. Але развіваць сістэму кемпінгаў проста неабходна. Гэта адна з асноўных мэт на наступны сезон. Амаль што не развіваецца моладзевы турызм. На Браславы і Нарач усё ж такі едуць больш сталыя людзі, а студэнты і падлеткі «катаюцца» ў Польшчу і Літву. Мабыць, ёсць сэнс падумаць пра стварэнне ў нас асобнага моладзевага курорта, кшталту турэцкай Анталі, — з клубамі, барамі, дыскатэкамі».

Для прывабління турыстаў у раённыя цэнтры на мясцовым узроўні плануецца стварэнне турысцка-інфармацыйных цэнтраў, звярнуўшыся ў якія замежны госць можа адначасова забраніраваць атэль, заказаць экскурсійны тур, а таксама задаволіць іншыя запатрабаванні. Акрамя гэтага, будзе працягвацца актыўнае ўкараненне анлайнавых і лічбавых тэхналогій — развіццё 3D-экскурсій, стварэнне спецыялізаваных прыкладных праграм для мабільных тэлефонаў, пашырэнне экскурсій па QR-кодах і г.д.

Дарэчы, па-ранейшаму істотную долю даходаў ад турызму, а менавіта 70%, забяспечваюць турысты з Расіі. Трошкі пашыраецца ўдзел Еўропы і Паўднёва-Усходняй Азіі. Па прызнанні Чэслава Казіміравіча, ёсць цяжкасці і ў пераадоленні «несезоннасці». «Пэўны даход прыносяць гасцінічны і санаторна-курортны адпачынак. Але, па вялікім рахунку, у перыяд з кастрычніка па красавік турыстычная галіна ў Беларусі прастойвае».

Найбольш развітай у турыстычнам плане з'яўляецца Віцебская вобласць, у значнай ступені дзякуючы актыўнаму супрацоўніцтву з усходнімі суседзямі — Смаленшчынай і Пскоўшчынай. Не саступае і Гродзенская вобласць. А вось Міншчына, па словах Чэслава Казіміравіча, на жаль, здае пазіцыі.

Нагадаем, гэты год быў прысвечаны развіццю «зялёнага турызму». Сярод замежных гасцей папулярнасць атрымалі экалагічныя маршруты — конныя, веласіпедныя, лодкавыя. Запатрабавальным аказаўся адпачынак у паляўнічых доміках — назіранні за дзікай прыродай, фотаздабыванне, пікнікі. Шмат турыстаў прынялі беларускія аграсядзібы.

А вось наступны сезон будзе накіраваны на развіццё «спартыўнага турызму». Безумоўна, асноўная стаўка робіцца на чэмпіянат свету па хакеі, які пройдзе ў Мінску ў маі наступнага года. Праблема размяшчэння ўсіх гасцей планетарнага форуму мусіць стаяць вельмі востра.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

■ У Беларусі

ПАЛІТЫЧНАЯ ВАГА

Яе не хапае беларускім партыям

У суботу, 21 верасня, падчас урачыстага сходу, прысвечанага 20-годдзю Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці (РППС), паміж ёю і партыямі «Справядлівая Расія»(РФ) і «Бірлік» (Казахстан) быў падпісаны мемарандум аб стварэнні саюза палітычных партый сацыялістычнага і сацыял-дэмакратычнага кірунку краін Мытнага саюза і Еўразійскай эканамічнай прасторы. Згодна з задумкай палітыкаў, асноўнай мэтай гэтага міжнароднага трохпартыйнага блока будзе падтрымка інтэграцыйных працэсаў, прасоўванне і давядзенне сацыял-дэмакратычных прынцыпаў развіцця да ведама кіраўніцтва краін, а таксама распрацоўка сумеснай стратэгіі падчас удзелу ў працы структур міжнароднай сацыял-дэмакратыі кшталту Сацінтэрна. Гэты крок — перспектыўная заяўка на стварэнне моцнага полюса беларускай левай ідэалогіі і замацаванне РППС у якасці яе прадстаўніка на міжнароднай арэне.

Такая актывізацыя РППС звязана не толькі з круглай датай, але і з рэаліямі сучаснага палітычнага жыцця, у тым ліку і з міжнароднай сітуацыяй. Справа ў тым, што працэсы еўразійскай інтэграцыі, у якіх бярэ актыўны ўдзел і наша краіна, прадугледжваюць стварэнне наднацыянальнай парламенцкай асамблеі, куды кожная краіна павінна будзе дэлегаваць сваіх прадстаўнікоў. У такіх умовах вага палітычных партый, якія маюць выразную ідэалагічную афарбоўку і сур'ёзных знешніх партнёраў, можа значна ўзрасці, і не толькі ў якасці фактара ўнутранай палітыкі, але і як значных знешнепалітычных суб'ектаў, што працуюць з пазіцый т.зв. «грамадскай дыпламатыі», то бок праваднікоў палітыкі «мяккай сілы» сваёй краіны. Менавіта падобныя думкі пра ролю партый у сучасных міжнародных адносінах агучыла падчас святочнага мерапрыемства РППС намеснік старшыні «Справядлівай Расіі» Таццяна Маскалькова.

У гэтай сітуацыі, асабліва калі разглядаць партыі як рэальны складнік знешняй палітыкі, трэба ўважліва паглядзець на сучасны партыйны патэнцыял Беларусі, у тым ліку ў параўнанні з нашымі асноўнымі партнёрамі — Расіяй і Казахстанам. Бо зразумела, што працэсы інтэграцыі, разам з некаторай уніфікацыяй эканамічнага жыцця і правіл гаспадарання, запатрабуюць і адноснага адзінства палітычнага працэсу. Пры тым, калі разглядаць сацыяльна-эканамічную рэальнасць, то беларуская дзяржава выглядае больш упарадкаванай і справядлівай у параўнанні з партнёрамі, але калі звярнуцца да аналізу ўзроўню развіцця публічнай палітыкі, то тут ёсць пытанні.

У Беларусі сёння афіцыйна зарэгістравана аж 15 палітычных партый рознай ідэалагічнай скіраванасці — ад камуністаў да нацыяналістаў, аднак грамадская вага іх зусім невялікая. Згодна з апытаннем, праведзеным Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, палітычным партыям давяраюць усяго 9% рэспандэнтаў, а не давяраюць 39%, рэйтынг усіх партыйных структур знаходзіцца ў межах статыстычнай памылкі. Найбольш высокім рэйтынгам (1,3%) можа пахваліцца Ліберальна-дэмакратычная партыя, а найбольш нізкі (0,1) — у Рэспубліканскай партыі.

Кіраўнік Інстытута сацыялогіі, доктар палітычных навук Ігар Катляроў лічыць, што «інстытут палітычных партый на Беларусі імкліва дэградуе, партыі перажываюць крызіс даверу, крызіс лідарства і крызіс ідэалагічнай ідэнтычнасці». Думка Ігара Катлярова ў цэлым супадае з ацэнкамі беларускага палітычнага жыцця, якую даюць іншыя айчынныя і замежныя эксперты. Адэкватнасць гэтай пазіцыі чарговы раз пацвердзілі вынікі выбараў у Палату прадстаўнікоў у 2012 годзе. З 110 абраных дэпутатаў усяго толькі 5 чалавек носяць у кішэні партыйныя білеты, прытым што, згодна з Выбарчым кодэксам, працэдура вылучэння партыйнага кандыдата больш простая і дазваляе пазбегнуць этапу збору подпісаў грамадзян.

Падобныя вынікі абумоўлены асаблівасцямі развіцця беларускага грамадства і дзяржавы ў перыяд з другой паловы 90-х да пачатку 2000-х гадоў: пасля краху савецкай сістэмы і перыяду крыклівага палітычнага папулізму першых гадоў незалежнасці беларускі электарат у большасці страціў цікавасць да публічнай палітыкі. На выбарах насельніцтва больш ахвотна аддае перавагу кандыдатам, абазнаным у пытаннях гаспадаркі, а не палітычным харызматыкам. Такая сацыяльная тэндэнцыя не магла не адбіцца на фарміраванні дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да палітычных партый: ва ўмовах адсутнасці грамадскіх запатрабаванняў ніякіх асаблівых захадаў у напрамку падтрымкі партыйнага будаўніцтва не прымалася. У выніку партыі прадзяржаўнага кірунку амаль спыніліся ў сваім развіцці, а апазіцыйныя структуры дэградавалі да ўзроўню дысідэнцкага руху, цалкам залежнага ад знешніх донараў. Фактычна на Беларусі склалася апартыйная палітычная сістэма ва ўмовах існавання 15 рознастайных партый.

Магчыма, такая сістэма і адпавядае сучаснай волі і ўзроўню палітычнай культуры беларускага народа, аднак цалкам дысаніруе з сітуацыяй у нашых партнёраў па Мытным саюзе. У Расіі і Казахстане дзейнічае прапарцыянальная выбарчая сістэма: казахскі Мажыліс сфарміраваны на трохпартыйнай аснове, у расійскай Дзяржаўнай Думе прадстаўлены чатыры партыі.

Не выключана, што на падставе некаторага падабенства ідэалогій і інтарэсаў казахскія і расійскія парламентарыі хутчэй дамовяцца паміж сабой у будучым еўразійскім парламенцкім органе, а беларускія дэлегаты могуць апынуцца перад фактам, які ўжо адбыўся. Можа атрымацца, што пасля значных поспехаў ва ўнутраным дзяржаўным будаўніцтве, Беларусь не здолее адстаяць уласныя пазіцыі ў міждзяржаўных структурах і будзе вымушана прыняць чужыя правілы.

Таму айчынным дэпутатам, акрамя майстэрства гаспадарыць, трэба засвойваць і навыкі палітыкі, а таксама вызначацца з ідэалагічнымі прыярытэтамі. Відавочна, што некаторыя рашэнні ў напрамку развіцця інстытута палітычных партый мусіць прыняць і дзейная ўлада. Да таго ж 63 дэпутацкія мандаты ў Палаце прадстаўнікоў належаць рэспубліканскаму грамадскаму аб'яднанню «Белая Русь», а пытанне аб партыйнай інстытуцыяналізацыі гэтай структуры дагэтуль канчаткова не вырашана.

Нас, беларусаў, часта крытыкуюць за тое, што мы маем цалкам прывабную краіну, але не працуем над уласным іміджам; маем унікальныя тэхналогіі і ўмеем вырабляць якасную прадукцыю, але не ўмеем яе прадаваць. Вельмі не хочацца, каб і ў палітыцы ды інтэграцыі Беларусь паўтарыла тыя ж памылкі. Час дыктуе нашай дзяржаве і грамадству неабходнасць стварэння якаснай партыйнай сістэмы, ідэалагічна разнастайнай, але адзінай па базавых каштоўнасцях, стрыжнем якіх мусіць быць суверэннае развіццё Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр ШПАКОЎСКІ

■

■ У свеце

ЧАМУ НЕМЦЫ ПРАГАЛАСАВАЛІ ЗА МЕРКЕЛЬ?

На парламенцкіх выбарах у Германіі, у адпаведнасці са звесткамі экзіт-полаў, перамога дастанецца блоку Хрысціянска-дэмакратычнага саюза і Хрысціянска-сацыяльнага саюза (ХДС/ХСС), які ўзначальвае цяперашні канцлер Германіі Ангела Меркель. Гэты блок набірае каля 42% галасоў выбаршчыкаў. У той жа час гэтага недастаткова для фарміравання ўрада, ХДС/ХСС спатрэбіцца фарміраваць кааліцыю з адной з іншых партый.

Адным з ключавых фактараў у фарміраванні ўрада з'яўляецца тое, ці пройдуць абмежавальны бар'ер свабодныя дэмакраты (СвДП), якія з'яўляюцца традыцыйнымі саюзнікамі ХДС/ХСС, і «Альтэрнатыва для Германіі». Паводле звестак экзіт-полаў, яны знаходзяцца на мяжы праходу, і сітуацыя нявызначаная. У выпадку, калі 5-працэнтны бар'ер гэтымі партыямі не будзе пераадолены, сілы складуцца прыкладна роўныя паміж ХДС/ХСС і галоўнымі канкурэнтамі на выбарах — сацыял-дэмакратамі (СДПГ). Паводле папярэдніх звестак, яны набіраюць 26% галасоў выбаршчыкаў, але ў іх ёсць два патэнцыяльныя саюзнікі — Левая партыя і «Зялёныя», якія набіраюць прыкладна па 8% галасоў. У той жа час пры такім раскладзе найлепшыя шансы сфарміраваць кааліцыйны ўрад будуць усё ж у ХДС/ХСС — яны змогуць утварыць кааліцыю з адной або дзвюма з гэтых трох апазіцыйных партый.

Чаму ж выбаршчыкі вырашылі за лепшае аддаць пальму першынства той партыі, якая знаходзіцца ва ўладзе ўжо два тэрміны? Можна меркаваць, што нямецкія выбаршчыкі станоўча ацанілі ўсю тую крытыку, а часам і шчырую лаянку на адрас Ангелы Меркель, якая ўсе апошнія гады неслася на яе адрас з іншых краін Еўразоны. Прычына: нямецкі канцлер аддае перавагу інтарэсам Германіі перад інтарэсамі Еўрасаюза, ашчадна расходуючы нямецкія грошы на выратаванне краін ЕС, якія апынуліся ў складаным становішчы з-за крызісу. Немцы, якія маюць рэпутацыю скупых прагматыкаў, і не ўхвалілі б іншую палітыку свайго канцлера, што Ангела Меркель цудоўна разумела.

Удалося Меркель і плаўна правесці Германію праз эканамічны крызіс, які пачаўся ў 2008 годзе. Зразумела, у самым цяжкім 2009 годзе эканоміка знізілася на 5,1 працэнта, але ўжо ў наступным узрасла на 4 працэнты і працягнула ўмераны рост у далейшыя гады. Вядома, важна для выбаршчыкаў і тое, што паказчык беспрацоўя ў Германіі — адзін з самых нізкіх у Еўропе. З 7,7 працэнта ў 2009-м ён скараціўся да 5,5% у 2012 годзе. Асабліва гэта важна

АД РОДНЫХ НІЎ У СЛУЦК НА СВЯТА

...з'ехаліся майстры-ўмельцы з розных раёнаў Мінскай вобласці. Дзясяткі напрамкаў народнай творчасці былі прадстаўлены тут лепшымі аўтарамі. Капыльскія і старадарожскія ручнікі, лагойская і івянецкая кераміка, клецкае і маладзечанскае лозапляценне, вілейская і мядзельская разьба па дрэве — усё гэта шматколяровым кірмашом размясцілася на цэнтральнай плошчы горада і суседніх вуліцах.

Абласное свята праводзілася згодна з Дзяржаўнай праграмай адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012-2015 гады. Добрым сімвалам фэсту стала навінка вулічнай скульптуры — фігура маладога ткача, абагульнены вобраз майстроў, якія ў XVIII-XIX ст. вырабляліі шаўковыя паясы з залатымі і сярэбранымі ніткамі на мануфактуры князя Радзівіла.

На святе кожны меў магчымасць паспрабаваць сябе ў старажытных рамёствах: вопытныя ўмельцы праводзілі майстар-класы пляцення традыцыйных беларускіх паясоў, у межах свята адбыўся конкурс «Беларуская лялька», дзе навучэнцы гурткоў і студый пазнаёмілі са сваёй творчасцю.

Святочны настрой удзельнікаў і гасцей свята спалучаўся з дзелавой атмасферай рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларускія паясы: гістарычныя шляхі развіцця і сучасная практыка». Вучоныя і спецыялісты-практыкі акрэслілі для сваёй размовы шырокае праблемнае поле. Галоўная ўвага была накіравана на гісторыка-мастацтвазнаўчы кантэкст. Абмяркоўвалі пытанні абрадавых функцый паясоў і месца іх у вусна-паэтычнай і літаратурнай творчасці. Даводзілі цікавыя звесткі пра значнасць пояса ў культуры славянскіх народаў, пра мануфактурную вытворчасць мастацкіх тканін на Беларусі.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.

Настаўніца Наталля ЛУКАШЫК і сямікласніца Арына ЛАБАДА з вёскі Суднікі знаёмілі гасцей свята з прыладамі для пляцення паясоў.

«У добры шлях!» — зычыў святу старажытны ткач.

Вырабы ўмельцаў можна было набыць на памяць пра свята і для карыстання ў хатняй гаспадарцы.

Вітольд МАЛЮТКА з вёскі Камень ведае шмат сакрэтаў традыцыйнага ткацтва.

■ На «лініі» — губернатар

ПА ТЭЛЕФОННЫМ ЗВАНКУ АСФАЛЬТ НЕ КЛАДЗЕЦЦА

У кожным раёне Гродзеншчыны і абласным цэнтры была створана камісія, якая вызначыла чарговасць рамонту жылых дамоў, дваравых тэрыторый, дарог, каналізацыі і іншых аб'ектаў інфраструктуры з абнародаваннем гэтых звестак у мясцовым друку.

Пра гэта **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА** паведаміў жанчыне, якая патэлефанавала на «прамую лінію» з вёскі Жыровіцы Слонімскага раёна з просьбай аб асфальтаванні дарогі ў гэтым населеным пункце.

— Я па тэлефонным званку распараджэнняў аб асфальтаванні не даю. Бо гэта несправядліва, калі чалавек дазваніўся да губернатара — і на яго вуліцы паклалі асфальт, а з іншай вёскі не дазваніліся — і не паклалі. Усё будзе рабіцца сумленна, згодна з вызначанай камісіяй чарговасцю рамонту дарог (ад горшых да лепшых), пра што людзі праінфармаваны ў мясцовых газетах, — зазначыў Сямён Шапіра.

Сёлета ў першачарговым парадку будзе заасфальтавана 126 кіламетраў дарог у сельскіх населеных пунктах і 50 кіламетраў — у Гродне. Сярод іх ёсць і такія, дзе не тое што праехаць — прайсці цяжка. Пры гэтым і іншыя дарогі, нават калі яны гравійныя, павінны быць у нармальным стане — з адпаведнай падсыпкай, грэйдаваннем. А што датычыцца асфальтавання, то гэта будзе рабіцца згодна з чарговасцю, устаноўленай у раёне.

А вось тэрміны вырашэння некаторых іншых пытанняў, па якіх людзі звярнуліся на «прамую лінію», ад чарговасці не залежаць. У прыватнасці, калі ў жылым будынку працякае дах альбо калі на прышкольных тэрыторыях няма тратуараў і асвятлення. Па такіх зваротах старшыня аблвыканкама адразу ж даў адпаведным кіраўнікам даручэнні, выкананне якіх узята на кантроль.

Дарэчы, бывае і так, што работы вядуцца, а людзі ўсё роўна не задаволены. Напрыклад, на «прамую лінію» патэлефанаваў жыхар аднаго з дамоў па вуліцы Пушкіна ў Гродне са скаргай, што пасля замены труб не прыведзена ў парадак дваравая тэрыторыя. Паведаміўшы яму тэрмін завяршэння работ, Сямён Шапіра выказаў такую думку:

— Сёлета ў Гродне прыводзяцца ў парадак дваравыя тэрыторыі, дзе пражывае 16 тысяч чалавек. Але пачынаеш рабіць — пачынаюцца і скаргі на нязручнасці. Але справіцца хутчэй цяжка, таму што такіх двароў дзясяткі, і хочацца шмат зрабіць. Гэта вялізны аб'ём работ, паколькі шмат дзе мяняюцца трубы, якія аджылі сваё і могуць выйсці са строю. Аднак, як той казаў, колькі дабра ні рабі — усё роўна дрэнным будзеш. Практычна ніхто яшчэ не патэлефанаваў і не падзякаваў за тое, што іх двор прыводзіцца ў парадак. Усё больш скардзяцца, што дрэва спілавалі, лаўку не паставілі... Таму прынята рашэнне, што ў наступным годзе работа на дваравых тэрыторыях будзе распачынацца толькі там, дзе ад тутэйшых жыхароў будзе адпаведная просьба.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ Факт

ШЛЯХАМ ГЕДЫМІНАВІЧАЎ

Разам з рэгіёнамі Украіны, Літвы і Польшчы Лідчына будзе ўдзельнічаць у міжнародным праекце «Шлях Гедымінавічаў».

Мемарандум аб супрацоўніцтве падпісалі старшыня Лідскага райвыканкама Аляксандр Астроўскі і выканаўчы дырэктар асацыяцыі органаў мясцовага самакіравання «Шлях Гедымінавічаў» Генадзь Друзенка (г. Луцк, Украіна). Праект скіраваны на тое, каб аб'яднаць украінскія, беларускія, літоўскія і польскія рэгіёны, дзе ў часы ВКЛ уладарыла дынастыя Гедымінавічаў, з мэтай папулярызацыі агульнай гісторыка-культурнай спадчыны.

Кар. «Звязды».

«СОНЕЧНЫ СВЕТ ДЛЯ ЎСІХ»

На Віцебшчыне адбылося абласное свята-конкурс выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва для людзей з абмежаванымі магчымасцямі «Сонечны свет для ўсіх».

Арганізаваў мерапрыемства Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Сярод іншага ў насычанай святочнай праграме была і экскурсія па музеі-сядзібе Рэпіна «Здраўнёва». Работнікі пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада «Віцязь» дапамаглі інвалідам цікава правесці час на прыродзе. Выратавальнікамі была прадастаўлена ваенна-палявая палатка, у якой для людзей, якія могуць рухацца толькі ў калясцы, устанавілі мультымедыйнае абсталяванне — для правядзення віртуальнай экскурсіі па музеі. Работнікі «Віцязя» таксама дапамагалі дзяўчатам-краязнаўцам арганізаваць правядзенне дэгустацыі прадукцыі віцебскіх прадпрыемстваў. І разам з удзельнікамі свята-конкурсу, дапамагаючы ім, выратавальнікі гулялі ў кракет, серсо і дартс.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Ёсць такі вопыт

«ПЛАНЕТА», «СЯБРЫНА» І ІНШЫЯ

Выпіць кавы, пагартаць газету... Чаму б і не?

Адзначыць 95-годдзе сваёй арганізацыі ў «Брэстаблсаюздруку» рыхтуюцца сціпла: маюць намер заахвоціць лепшых работнікаў. Зараз на парадку дня — удасканаленне метадаў гандлю і дастаўкі, накіраванае на эканомію і беражлівасць.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Аліна ГЛАДКОВА, прадавец крамы «Планета», на абласных «Дажынках» у Ляхавічах.

Аднойчы пралічылі ўсё, супаставілі і прыйшлі да высновы, што ў многіх раёнах можна скасаваць склады прадукцыі. Тым больш, што быў станоўчы вопыт Жабінкі. У гэтым, бліжэйшым ад Брэста райцэнтры, дастаўка тавару з Брэста даўно ажыццяўлялася без усялякіх прамежкавых звёнаў. І цяпер ужо ў сямі раёнах няма складоў, усе тавары завозяцца з абласнога цэнтра адразу ў гандлёвыя кропкі. Такім чынам сэканоміць удалося на памяшканнях, штатных адзінках і транспарце.

З'явілася магчымасць на вызваленыя сродкі абнаўляць павільёны і крамы, рабіць свае гандлёвыя пункты больш сучаснымі і зручнымі для пакупніка.

— Зараз вялікая работа вядзецца ў Пружанах, — расказвае **дырэктар прадпрыемства Брэстаблсаюздрук» Таццяна ЗІНЕВІЧ**. — У памяшканні раённага аддзялення «Саюздрука» вызвалілі плошчы, праводзім рэканструкцыю, каб адкрыць тут сучаснае гандлёвае прадпрыемства. Будзе нешта накшталт брэсцкай «Сябрыны», якую адкрылі ў памяшканні «Аблсаюздрука». Цяпер там адна з самых паспяховых гандлёвых кропак. Ёсць нават кніжная зала, дзе можна на ўтульных канапах і крэслах выпіць кавы.

Хутка і ў Пружанах адчыніць дзверы сучаснае прадпрыемства, дзе стане магчымым пагартаць свежую газету, пазнаёміцца з кніжнымі навінкамі, а таксама купіць канцылярскія, галантарэйныя, іншыя тавары па вельмі дэмакратычных цэнах. Дарэчы, нядаўна праводзілі манітарынг цэн на розныя віды тавараў у абласным цэнтры. Аказалася, што многія з іх у кіёсках і крамах «Аблсаюздрука» самыя танныя. Гэта значыць, што гандлёвая арганізацыя прымяняе мінімальныя нацэнкі, бо разлічвае на сярэдняга пакупніка і імкнецца такім чынам заваяваць яго прыхільнасць.

Неўзабаве з'явіцца крама самаабслугоўвання і ў Століне. Усяго сёлета ўстаноўлена дзевяць сучасных павільёнаў-крам. Прадпрыемства ўжо добрую пяцігодку ідзе па гэтым шляху. І з 171 гандлёвага прадпрыемства абласной сістэмы 69 працуюць як крамы альбо павільёны, дзе пакупнік не падае грошы ў акенца, а сам выбірае патрэбны тавар. Такая форма гандлю, паводле слоў Таццяны Зіневіч, паказала сябе як найбольш прагрэсіўная, яна адпавядае інтарэсам як пакупніка, так і гандляра. Крамы адразу павялічылі выручку, а кліенты атрымалі магчымасць выбраць патрэбную ім рэч, тавар, перыядычнае выданне. Продаж газет і часопісаў прыкметна адрозніваецца ў павільёнах самаабслугоўвання ад рэалізацыі ў традыцыйных кіёсках.

— Мы не забываем, што першапачаткова з'яўляемся прадпрыемствам «Саюздрука», — гаворыць Таццяна Пятроўна. — Таму рэалізацыі перыёдыкі надаём асаблівае значэнне. Рэгулярна праводзім агляды продажу газет па ўсёй сістэме. Паводле апошняга падвядзення вынікаў, найлепш у гэтым кірунку працуюць кіяскёры і прадаўцы Кобрынскага, Пружанскага, Іванаўскага, Драгічынскага раёнаў. Газету трэба ўмець прапанаваць пакупніку.

У гэтым не раз пераконваліся работнікі прадпрыемства, калі арганізоўвалі выязныя гандаль на абласных фестывалях, кірмашах, святах. Палатка «Саюздрука» заўсёды працуе на «Мотальскіх прысмаках», абласных «Дажынках». Вось і цяпер у Ляхавічах на абласное свята хлебаробаў выязджалі работнікі брэсцкай крамы «Планета». Падобныя выязныя мерапрыемствы разглядаюцца прадпрыемствам не як камерцыйны праект, а, хутчэй, як рэкламны. З'яўляецца магчымасць, што называецца, людзей паглядзець і сябе паказаць. На такіх фестывалях заўсёды добра прадаюцца газеты.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Добрая навіна

МІНУС НАВЕДВАННЕ ПАЛІКЛІНІКІ

У Гомелі нарэшце адкрыўся Палац водных відаў спорту. Ён размешчаны побач з лядовым палацам і тэніснымі кортамі, таму можна лічыць, што ў горадзе над Сожам, у мікрараёне Валатава, створаны адмысловы спартыўны гарадок, дзе ўсё зроблена на самым сучасным узроўні. Напрыклад, спецыялісты сцвярджаюць, што тут можна будзе праводзіць спаборніцтвы па плаванні і скачках у ваду любога ўзроўню, у тым ліку пад эгідай Алімпійскага камітэта.

У інфраструктуры палаца — першы ў абласным цэнтры з паўмільённым насельніцтвам 50-метровы басейн з дзесяццю дарожкамі. Глыбіня яго паўсюль — 2,1 м. Ёсць басейн для скачкоў у ваду глыбінёй 6 м і невялікі дзіцячы. Комплекс абсталяваны трамплінамі ад 1 да 10 метраў і вышкамі да 10 м, спецыяльнымі заламі для сухога плавання, памяшканнямі для размінкі спартсменаў і заняткаў на трэнажорах. Медыка-аднаўленчы цэнтр аснашчаны комплексам спецыяльнага абсталявання. Адначасова ў двух басейнах і спартыўных залах змогуць займацца больш за 300 чалавек. Дарэчы, трыбуны, адкуль вельмі зручна назіраць за ходам спаборніцтваў, разлічаны на 500 гледачоў.

Вядомая беларуская плыўчыха, двухразовая сярэбраная прызёрка Алімпіяды ў Лондане Аляксандра Герасіменя паспрабавала гомельскую ваду і лічыць, што з'яўленне новага спартыўнага аб'екта такога ўзроўню важнае і для прафесіяналаў, і для аматараў гэтага віду спорту:

— Мне спадабалася — вельмі лёгкая вада! Прыемная атмасфера і толькі станоўчыя ўражанні. Добра, што з'явілася новая база, дзе можна праводзіць зборы і рыхтавацца для спаборніцтваў. Увогуле ў нашай краіне пакуль не хапае баз, дзе можна было б трэніравацца. У нас ёсць людзі, якія, паверце, могуць дабівацца поспехаў. Галоўнае — іх знайсці, для гэтага і важна праводзіць папярэднюю селекцыю — адбор яшчэ на ўзроўні звычайнай школы.

На цырымоніі адкрыцця басейна намеснік прэм'ер-міністра, старшыня Беларускай федэрацыі плавання Анатоль Тозік адзначыў, што з'яўленне гэтага спартыўнага аб'екта — знакавая падзея не толькі для горада над Сожам, але і ўсёй Беларусі:

— У краіне гэта ўжо восьмы па ліку 50-метровы басейн. Кожнае наведванне гэтага палаца — мінус адно наведанне паліклінікі. Трэба, каб ён вельмі інтэнсіўна працаваў у любы час сутак. Спадзяюся, што праз 10 гадоў на дошцы дасягненняў гэтай установы будуць партрэты нашых новых чэмпіёнаў свету па плаванні.

У гэты ж дзень у гомельскім палацы водных відаў спорту прайшлі паказальныя выступленні спартсменаў па сінхронным плаванні, скачках з трамплінаў, спаборніцтвы сярод плыўцоў.

Дарэчы, разавае наведванне (45 хвілін) чашы басейна для дарослых каштуе ад 25 000 да 35 000 рублёў. Невялікі басейн можна арандаваць для правядзення дзіцячага свята.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара

«НАЛЯТАЙЦЕ, КАШАЛЁЧКІ АДКРЫВАЙЦЕ!»

Як у Гродне на «сырнай вуліцы» сыр дэгуставалі

■ І мы там былі

І не толькі каштавалі, але і стаялі па сыр у чэргах. Калі такое здаралася? І хто кажа, што гэты прадукт пакуль у Беларусі не надта запатрабаваны? Можа, праблема не толькі ў нейкіх нацыянальных прыярытэтах у харчаванні, а ў яго слабай папулярызацыі? Крок у выпраўленні сітуацыі быў зроблены на першым у горадзе над Нёманам фестывалі сыру, які адбыўся па ініцыятыве мясцовых улад і гродзенскага ААТ «Малочны свет» («Молочный Мир»).

Прадуктовыя фестывалі ў свеце вельмі папулярныя: віна, шакаладу, вінаграду, кавы, гастранамічныя, кулінарныя. Не адстаюць і сыраварны. Сырныя фестывалі сталі ўжо традыцыйнымі ў ЗША, Канадзе, Італіі, Вялікабрытаніі ды і ў краінах былога СССР. Напрыклад, у Львове свята сыру і віна доўжыцца тры дні. Падчас такіх імпрэз колькасць гатункаў дасягае некалькіх соцень, а аб'ёмы дэгустацыіі і пакупкі сыру вымяраюцца тонамі. Прычым галоўнае нават не ў камерцыйнай выгадзе вытворцаў тут і цяпер, а ў доўгатэрміновых задачах папулярызацыі гэтага старажытнага прадукту. Што ў фестывальнай, гульнявой форме атрымліваецца куды больш эфектыўна ў параўнанні з любой рэкламай.

Зразумела, што пераканацца ў гэтым павінна і Беларусь — краіна, якая ўваходзіць у пяцёрку вядучых экспарцёраў малочнай прадукцыі (каля 60 % ад агульнага аб'ёму вытворчасці) і разам з тым мае зусім невялікія паказчыкі ўнутранага спажывання сыру. Паводле розных ацэнак, ад двух да трох кілаграмаў на чалавека за год. Тады як у нашых суседзяў з Польшчы і Літвы — 12 кілаграмаў, а ў сярэднім у краінах Еўрасаюза — 19. Хоць асартымент гэтай прадукцыі ў нас даволі значны: вырабляецца больш за 160 найменняў сыру.

У першы дзень фестывалю прайшоў конкурс якасці сярод вытворцаў сыру, які ацэньвала прафесійнае журы. А назаўтра сыраварны з Гродна, Навагрудка, Ашмян, Шчучына, Дзятлава, Бярозы і Высокага стварылі ў парку імя Жана Эмануэля Жылібера «сырны горад», дзе ўсе кварталы былі названы ў гонар сыру. Там выкарыстоўвалася спецыяльная «валюта» — сырнік — і распаўсюджвалася фестывальная грамадска-сырная газета «Сырны веснік» з праграмай свята, прадстаўленнем удзельнікаў і байкамі пра сыр.

Сырныя фестывалі сталі ўжо традыцыйнымі ў многіх краінах. Падчас такіх імпрэз колькасць гатункаў дасягае некалькіх соцень, а аб'ёмы дэгустацыіі і пакупкі сыру вымяраюцца тонамі.

Фестываль адкрыла каралева «сырнай краіны», якая пад'ехала конным экіпажам да «сырнай эстрады», дзе потым дэманстраваліся відэаролікі пра вытворцаў, прыводзіліся звесткі з гісторыі сыраварства, а самадзейныя акцёры з цэнтра культуры г. Гродна паказалі спектакль «Усе мышы любяць сыр».

Побач размясцілася «сырная галерэя», дзе свае вырабы дэманстравалі кулінары з гродзенскіх рэстаранаў і кавярняў.

У рамках фестывалю таксама прайшоў конкурс малюнкаў гродзенскіх школьнікаў «Сырнае шчасце». Творча падышлі да сваёй прэзентацыі і сыраварны. Напрыклад, каля павільёна гродзенскага ААТ «Малочны свет» нельга было не звярнуць увагі на велізарную галоўку сыру, якую вырабілі спецыяльна да фестывалю. «Гэта сыр шчасця, загадвайце жаданне», — прапанавалі прахожым. У «групу падтрымкі» Ашмянскага сыраробнага завода ўваходзілі артысты з народнага ансамбля «Жытніца» Кракоўскага дома культуры. А Адэльскі цэнтр культуры і народнай творчасці (Гродзенскі раён) ладзіў на «сырным дворыку» конкурсы для ўсіх ахвотных — па вытворчасці масла і адцісканні тварагу дзедаўскім спосабам. У якасці прыза пераможцам — прадукт, які самі ж і вырабілі.

Рэкламу дзятлаўскаму сыру некалькі гадзін, амаль без перапынку, рабіла прыгажуня, да якой проста нельга было не прыслухацца: «Налятайце, кашалёчкі адкрывайце!» І сапраўды, чаму б не раскашэліцца ў такой цудоўнай атмасферы, ды яшчэ пасля дэгустацыі, якую, не шкадуючы сваёй прадукцыі, у вялікім асартыменце ладзілі ўсе прадпрыемствы? Пры гэтым прыемнае можна было спалучыць з важным і карысным для сыравараў. Якія гатункі найбольш падабаюцца спажыўцам? Свае думкі ў дачыненні сыру таго ці іншага тыпу, а таксама навінак выказвалі ўдзельнікі народнага конкурсу-дэгустацыі «Чэмпіён смаку». Не ведаючы вытворцаў, яны ацэньвалі зашыфраваную пад нумарамі прадукцыю з чатырох прадпрыемстваў і галасавалі за два лепшыя ўзоры.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі, адзін з арганізатараў свята сыру, выказаў пажаданне, каб пасля фестывалю спажыванне гэтага прадукту ў нас павялічылася хаця б удвая. І гэта, мяркуючы па зацікаўленасці гродзенцаў, аб'ёмах дэгустацыі і пакупак у «сырным горадзе», зусім не фантастыка.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Віншуем **Аляксея Мікалаевіча БАРОДЗІЧА** з днём нараджэння. Жадаем шчодрых ураджаяў на палескай ніве, зладжанай працы і ўзаемаразумення ў новым калектыве, бадзёрага настрою і здароўя.

Праўленне СВК «Палеская ніва» Столінскага раёна.

Ад шчырага сэрца віншуем моладзевы **экіпаж старшага камбайнера Сяргея ГОЛІКА і камбайнера Аляксея ТЫНКОВІЧА** з перамогай у абласных спаборніцтвах на жніве-2013. Камбайнам «Джон Дзір 9640 і WTS» яны намалацілі 1003,9 тоны збожжа, або 1074 тоны на ўмоўны камбайн. Жадаем ранейшым пераможцам рэспубліканскіх спаборніцтваў стаць імі ў чарговы раз. Сяргей і Аляксей, працоўны калектыў ААТ ганарыцца вамі — так трымаць!

Адміністрацыя і прафкам ААТ «Драгічынскі камбікормавы завод».

ПАШТАЛЬЁН І АПЕРАТАР — ПРАФЕСІІ ПРЭСТЫЖНЫЯ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каб даказаць гэта, каманды чаго толькі ні прыдумалі: зладзілі ці не сапраўднае шоу «Шукаю цябе», набіралі каманду на «Паштовы каўчэг», малявалі на пяску, чыталі цэлыя паэмы, спявалі куплеты, цытавалі класікаў... Іншымі словамі — агітавалі за сваю прафесію ўсімі магчымымі сродкамі! Прычым рабілі гэта настолькі прыгожа і шчыра, што прысутным было цяжка ўстрымацца ад слёз.

З чаго вынікала, здаецца, агульнавядомае. Ну па-першае, з прафесіяй і паштальёна, і аператара сувязі заўсёды і ўсюды знойдзеш працу, знойдзеш заробак і так званую сацыяльную абароненасць, атрымаеш пастаянную магчымасць для прафесійнага росту і пашырэння кругагляду... Немалаважна і тое, што цябе будуць пазнаваць на вуліцах і чакаць у кватэрах, як самых блізкіх сяброў.

Ацэньвала журы і адмысловыя выступленні на тэму беражлівасці, падчас якіх каманды заклікалі захоўваць не толькі звычайнае (электраэнергію, ваду, паперу...), але і час сваіх кліентаў, і іх нервовыя клеткі, і — што было досыць нечаканым — нават кнігу скаргаў, бо калі туды нічога не пісаць, яна... паслужыць даўжэй.

Зрэшты, вось гэта — дэманстрацыя выдумкі, знаходлівасці, артыстычнасці і безлічы іншых талентаў — патрабавалася пераважна ў самым пачатку конкурсу. На другі дзень пачалася праверка ведаў і практычных навыкаў.

— Не магу сказаць, што пытанні былі складаныя, бо ўсе яны датычыліся таго, з чым сутыкаешся кожны дзень, — прызнавалася потым **паштальён АПС № 2 Барысаўскага РВПС Таццяна Альшаннікова.** — Але ж у экзаменатараў часам было жаданне трошкі заблытаць, збіць з панталыку. Я на гэта старалася не паддавацца.

І мела ж рацыю! Бо менавіта яна, Таццяна, стала лепшай, першай сярод паштальёнаў! Яна ж набрала максімальную колькасць балаў як у веданні тэорыі, так і ў дэманстрацыі практычных навыкаў, чым заслужыла ганаровыя званні «Лепшы знаўца паштовай справы» і «Лепшы майстар паштовай справы».

І ўсё гэта — пасля... двух гадоў працы па прафесіі!

«Мне бывае крыўдна, калі ў нейкую сям'ю не прыходзіць нічога. Гэтак жа і чытаць можна развучыцца! Таму я, часам, афармляю падпіску ў падарунак — за свае грошы».

— Да гэтага я, можна сказаць, шукала сябе, — расказвала пераможца. — Працавала прадавачкай у крамах і на рынку, была кур'ерам... Усё нешта не тое было. А тут, на пошце, мне вельмі спадабалася! У нас цудоўны калектыў, цудоўная начальнік аддзялення сувязі. Да таго ж тут большая зарплата... Але яе яшчэ трэба зарабіць. Шмат залежыць ад падпіскі, бо паштальён, што б там ні казалі, усё ж можа зацікавіць тым ці іншым выданнем. Мне бывае крыўдна, калі ў нейкую сям'ю не прыходзіць нічога. Гэтак жа і чытаць можна развучыцца! Таму я, бывае, афармляю падпіску ў падарунак — за свае грошы. А там, глядзіш, людзі за месяц прывыклі нешта атрымліваць і ўжо выпісваюць самі, прычым не адно выданне, а некалькі... Каб нешта ўзышло, трэба сеяць!

У гэтым выпадку паміж паштальёнам і яе кліентамі «ўзышла», так бы мовіць, самая шчырая сімпатыя, бо апошнія падчас конкурсу вельмі перажывалі за Таццяну, тэлефанавалі ёй. І як жа рады былі перамозе! Не кажучы ўжо пра саму жанчыну, якая проста не магла трымаць у руках усе граматы, кветкі, прызы і дыпломы!..

Члены журы (у тым ліку старшыня — генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Ірына Саксонава) з камандай Гродзенскага філіяла (першае месца).

Другое месца журы прысудзіла **паштальёну аддзялення паштовай сувязі (АПС) «Абяроўшчына» Камянецкага РВПС Наталлі Сукач, трэцяе — Святлане Кісель з АПС № 3 Слуцкага РВПС.**

Сярод аператараў першынство заваявала Людміла Шум (АПС «Краснасельскі» Ваўкавыскага РВПС), другое — Наталля Рудзяк (АПС № 16 цэха паштовай сувязі Брэсцкага філіяла) і трэцяе — Катажына Прыймак (Смаргонскі РВПС). Усім пераможцам былі ўручаны адпаведныя дыпломы і падарункавыя сертыфікаты на суму ад 4 (за першае месца) да 3 мільёнаў рублёў.

Дыплом і кубак пераможцы ў напружанай камандной барацьбе заваявала каманда **Гродзенскага філіяла, на другім месцы — Брэсцкі філіял, на трэцім — Гомельскі.**

Як заўсёды, адзначыла журы і найлепшае хатняе заданне (першае месца ў каманды **Гомельскага філіяла**), і найцікавейшы дызайн фірмовага адзення **(першынство ў Віцебскага філіяла),** і найлепшае веданне тэхнікі бяспекі, і вернасць прафесіі, і самы яркі прафесійны дэбют, і смеласць ды знаходлівасць... Нават усмешку, індывідуальнасць!

А яшчэ было безліч кветак і розных падарункаў — ад аб'яднанай арганізацыі прафсаюза і, вядома ж, ад рэдакцыі газет. Нашы, звяздоўскія, сувеніры ўручаны паштальёнам **Вользе Міронавай з АПС Балотня Рагачоўскага РВПС, Людміле Лысені з АПС Новадзявяткавічы Слонімскага РВПС і ўсё той жа Таццяне Альшаннікавай з АПС-2 г. Барысава,** бо, як высветлілася, менавіта яны носяць падпісчыкам максімальную колькасць экзэмпляраў «Звязды».

Лепшы аператар Людміла Шум (АПС Краснасельскі Ваўкавыскага РВПС)

А яшчэ ўсіх удзельнікаў конкурсу мы прасілі ва ўсе куточкі краіны развезці нашы календары — у тым ліку і на новы 2014 год. З надзеяй, што і надалей будзем з чытачамі — дзякуючы аператарам паштовай сувязі і паштальёнам, якія аформяць падпіску і потым пяць разоў на тыдзень будуць прыносіць свежыя нумары адзінай штодзённай беларускамоўнай газеты.

Валянціна ДОЎНАР

■ Сезон нарыхтовак

ВОСЕНЬ: ЧАС ПАПАЎНЯЦЬ ХАТНІЯ «ЗАСЕКІ»

21-22 верасня прадпрыемствы Мінска і сталічнай вобласці распачалі сезон кірмашоў «Шчодрая восень-2013», які завершаць арганізацыі Магілёўшчыны ажно 26-27 кастрычніка. Арганізатарам мерапрыемства выступае Мінсельгасхарч разам з Мінскім гарвыканкамам і выканаўчымі камітэтамі ўсіх шасці абласцей.

Наведнікам прапануюць айчынныя агародніну і садавіну, гатовую прадукцыю раслінаводства, свініну, ялавічыну, мяса птушкі, мясныя і малочныя прадукты і паўфабрыкаты, хлебабулачныя і кандытарскія вырабы. У продажы таксама жывая сажалкавая рыба і прадукты з яе. Разам з сельскагаспадарчымі вытворцамі, мяса- і малочнаперапрацоўчымі арганізацыямі, арганізацыямі мукамольна-крупяной, кандытарскай і хлебапякарнай галін у выставе-кірмашы бяруць удзел нарыхтоўчыя арганізацыі Белкаапсаюза, арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання. Наведнікі змогуць паспытаць юшку, прыгатаваную на ваенна-палявой кухні, свініну на ражне, шашлык, бліны, узяць удзел у культурна-забаўляльнай праграме. Для інвалідаў і ветэранаў арганізаваная бясплатная дастаўка набытай на кірмашы сельскагаспадарчай прадукцыі.

Сяргей РАСОЛЬКА

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Радзімазнаўчая скарбонка

ПАМЯЦЬ ЯК ГАЮЧАЯ КРЫНІЦА...

Жыццёвы і навукова-творчы лёс гісторыка і архівіста Віталя Скалабана сябры і калегі ўзгадалі ў кнізе «Ісці на святло лабірынтам даўніх падзей».

Вельмі цяжкая страта ў гістарычнай навуцы апошніх гадоў — смерць Віталя Уладзіміравіча Скалабана.

Выдаўшы кнігу ўспамінаў пра выдатнага даследчыка, збіральніка памяці зямлі беларускай, а таксама кнігу бібліяграфіі і артыкулаў па тэмах, блізкіх і часам запачаткаваных В. Скалабанам, аўтары і выдаўцы зборніка засведчылі выключны маштаб, грамадскае прызнанне гістарычнага публіцыста і Архівіста з вялікай літары. Адна з першых яго публікацый — «Будынак новы мы будуем...», праз якую Віталь Уладзімір пазнаёміў чытачоў гадавіка «Дзень паэзіі» з вершамі малавядомага Паўла Каравайчыка. У «Братэрстве-83» гісторык адкрываў імя і творчасць Івана Баранкевіча. Адна з публікацый называлася — «Упершыню, ...першы, ... першая». Гэта — аб стварэнні Беларускага нацыянальнага камісарыята ў Маскве ў 1918 годзе. А былі ж яшчэ — «Барвы першай зоркі» (пра газету «Дзянніца»), «Першыя крокі рэспублікі»... Ён быў сапраўды першапраходцам. Многія ініцыятывы прыўносіў у святкаванне юбілейных для Беларусі дат, іх інфармацыйнае забеспячэнне. Сапраўдным навуковым подзвігам Віталя Скалабана можна лічыць яго арганізацыйныя і асабістыя шукальніцкія намаганні па зборы, укладанні трохтомнай «архіўна-дакументальнай анталогіі» «Купала і Колас, вы нас гадавалі». У ёй аб'яднаны плён дзейнасці не толькі беларускіх архівістаў, але і руплівых расійскіх збіральнікаў гістарычнай памяці, навукоўцаў розных архіваў і бібліятэк з Расійскай Федэрацыі. Цяпер, відавочна, айчыннае купалазнаўства і коласазнаўства цяжка ўявіць без гэтай працы.

Добрыя, цёплыя, шчымлівыя словы ў зборніку «Ісці на святло лабірынтам даўніх падзей» гавораць пра В. Скалабана Людміла Рублеўская, Віктар Шніп, Радзім Гарэцкі, Аляксей Каўка, Ганна Запартыка, Анатоль Бутэвіч і шмат хто яшчэ.

Максім ЛАДЫМЕРАЎ

ЯРКІ СЛЕД...

23 верасня 2013 года на 89-м годзе пайшла з жыцця актыўная ўдзельніца Вялікай Айчыннай вайны, старшына ў адстаўцы, ветэран працы Зінаіда Васільеўна Корж — дачка праслаўленага беларускага партызана, Героя Савецкага Саюза Васіля Захаравіча Каржа.

Разам з сястрой Вольгай добраахвотніцай пачала вайну ў 4-м Кубанскім кавалерыйскім корпусе ў якасці сястры міласэрнасці.

...Калі ішлі баі за вызваленне Украіны, старшаму сяржанту Зінаідзе Корж ішоў сямнаццаты год. У атацы пад Макееўкай асколак снарада параніў яе ў сцягно. Страціўшы прытомнасць, яна звалілася з каня. Байцы палічылі яе забітай... Зінаіда знаходзілася ў шпіталі каля паўгода. Доўга накульгвала. Строгая медкамісія выдала дакумент аб тым, што да армейскай службы яна непрыдатная. А корпус у той час ужо змагаўся дзесьці ля Чорнага мора. Даведаўшыся пра гэта, Зіна вырашыла, што ніяк не зможа застацца ўбаку, і, парваўшы дакумент аб інваліднасці, вярнулася ў родны корпус незадоўга да баёў за Адэсу.

Для яе аперацыя па вызваленні Беларусі «Баграціён» пачалася дажджлівай чэрвеньскай раніцай. Асабліва запомніўся страшны па напале бой за Гарадзею, куды першымі ўварваліся коннікі яе 9-га палка.

Пазней ўдзельнічала ў вызваленні шэрагу гарадоў Еўропы. Зінаіда змагалася да самай Перамогі і нават... пасля яе, калі гвардзейцы палка амаль трое сутак грамілі рэшткі варожых войскаў у лясах на поўдзень ад Прагі.

Зінаіда Васільеўна годна прайшла свой баявы шлях. Яна ніколі не была «генеральскай дачкой», не хавалася за чужыя спіны. І Радзіма па заслугах ацаніла баявыя справы адважнай кавалерысткі. Зінаіда Васільеўна Корж скончыла вайну з баявымі ўзнагародамі: медалём «За адвагу», ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны II ступені, а таксама іншымі ўзнагародамі.

Зінаіда Васільеўна Корж з бацькам, Героем Савецкага Саюза Васілём Захаравічам. г. Масква, 1945 год.

Пасля вайны і замужжа яна дзяліла ўсе цяжкасці афіцэрскай службы мужа, шмат працавала на розных участках, займалася грамадскай работай у ветэранскіх арганізацыях, выхаваннем маладога пакалення. Цяжка пакуль усвядоміць усю горыч гэтай страты. Дзякуй Вам, Зінаіда Васільеўна, за годную працу і той яркі след, які вы пакінулі ў жыцці многіх людзей як цудоўны чалавек, удзельніца вайны, клапатлівая маці! Помнім, любім Вас і смуткуем!

Мікалай СМІРНОЎ.

■ Паветраны шлях

З МІНСКА У БЯЛГРАД — ЗА ТРЫ ГАДЗІНЫ

Транспартную паветраную сувязь паміж гэтымі гарадамі цяпер будуць падтрымліваць рэгулярныя рэйсы нацыянальнай авіякампаніі «Белавія». 19 верасня адбыўся першы рэйс. Самалёт будзе вылятаць з Мінска двойчы на тыдзень — па панядзелках і чацвяргах.

Поўная назва рэйса — «Мінск — Будапешт — Бялград — Будапешт — Мінск», так што, акрамя сталіцы Сербіі, транспартная сувязь цяпер наладжана і з венгерскай сталіцай.Час палёту з улікам стаянкі ў Будапешце — каля 3,5 гадзіны.

— Думаю, гэты рэйс будзе цікавы турыстам, а таксама паспрыяе наладжванню бізнес-сувязяў паміж трыма дзяржавамі. Акрамя таго, павялічыцца колькасць прамых і транзітных турыстаў, што едуць праз Мінск у краіны СНД і Азіі, — лічыць генеральны дырэктар Нацыянальнай авіякампаніі «Белавія» Анатоль Гусараў.

Пакуль што рэйс «Мінск — Будапешт — Бялград — Будапешт — Мінск» — адзіны рэгулярны рэйс беларускага перавозчыка, які звязвае Мінск адразу з двума пунктамі прызначэння ў дзвюх розных дзяржавах.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■ Спорт-тайм

БАТЭ ВЯРТАЕ ЛІДАРСТВА

У выхадныя адбылася знакавая падзея ў айчынным першынстве па футболе. Барысаўскі БАТЭ перамог салігорскі «Шахцёр», галоўнага канкурэнта за залатыя ўзнагароды, і пасля доўгага перапынку зноў вярнуўся на першае месца чэмпіянату. Пра гэта і іншае чытайце ў спартыўным аглядзе «Звязды».

Першая ліга. «Смалявічы СТІ» не пакінулі «Гарадзеі» ніякіх шанцаў — 4:0!

1.Бітва футбольных волатаў краіны. Менавіта так можна было назваць рандэву барысаўскага БАТЭ і салігорскага «Шахцёра». Каманды Віктара Ганчарэнкі і Уладзіміра Журавеля апошнія гады дыктуюць моду ў беларускім футболе. Балельшчыкі з цікавасцю чакалі гэтай сустрэчы, але сапраўднай «бойкі» не адбылося. Чэмпіёны ўлёўнена перайгралі гарнякоў (3:0) і зноў трапілі на першы радок турнірнай табліцы. «Мы ўсцешаны, што выйшлі на першае месца, — зазначыў пасля сустрэчы Віктар Ганчарэнка. — У нас наперадзе атрымалася абысці «гарнякоў». Лік 3:0 — важкая перавага. Каманда нашага класа ўмее даводзіць падобныя сітуацыі да пераможнага канца». Адзначым і іншыя вынікі 24-га тура: «Нёман» у Гродне сустрэў мінскаму «Дынама» (0:1), «Тарпеда» з Жодзіна на хатняй арэне перамагло «Гомель» (2:1), мазырская «Славія» была лепшай за «Дняпро» (2:1), «Белшына» ў Бабруйску не пакінула шанцаў «Мінску» (3:1), а «Нафтан» прайграў брэсцкім дынамаўцам (1:3). Цікава, што гэтую перамогу «Дынама» атрымала ўжо з новым трэнерам. Клуб з берагоў Буга скасаваў кантрактную дамову з Уладзімірам Курневам. Выконваць абавязкі галоўнага трэнера даручана карэннаму брастаўчаніну Андрэю Пракапюку.

Цікавыя вынікі, між іншым, аматарам спорту падкідвае не толькі вышэйшая ліга, але і першая. На лідзіруючых пазіцыях там «Слуцк» і «Гарадзея» — дасведчаныя каманды, якія з'яўляюцца асноўнымі прэтэндэнтамі на павышэнне. І кожны згублены імі бал падобны сенсацыі, выклікае супярэчлівыя эмоцыі. А чарговы тур якраз прынёс адзін з самых нечаканых вынікаў першынства: клуб «Смалявічы СТІ» на сваім полі перамог «Гарадзею» з хакейным лікам 4:0 і даказаў, што сапраўдны футбол жыве не толькі ў вялікіх гарадах! Адметна, што галявым дублем у гэтай сустрэчы адзначыўся былы футбаліст зборнай Беларусі Алег Страхановіч.

2. Мінскае «Дынама» ў Кантынентальнай хакейнай лізе атрымала ў сёлетнім сезоне ўжо 7-е паражэнне. На гэты раз «зубры» ў гасцях саступілі яраслаўскаму «Лакаматыву» (1:4). Адзінай шайбай у складзе сталічнай каманды вызначыўся Аляксей Калюжны.

3. На кантынентальным першынстве па валейболе, які праходзіць у Даніі і Польшчы, наша мужчынская зборная саступіла ў трох матчах групы «А» і не трапіла ў раўнд плэй-оф. Спачатку беларусы прайгралі бельгійцам (0:3), пасля — італьянцам (1:3), а ў апошняй сустрэчы ў напружаным супрацьстаянні яны саступілі зборнай Даніі (2:3).

4. На жаль, гандбольны клуб «Дынама» (Мінск) прайграў у першым матчы сёлетняга розыгрышу Лігі чэмпіёнаў. У апанентах «Дынама» быў французскі ПСЖ, які лічыцца самай багатай камандай свету. Цягацца на роўных з калектывам, за які гуляе ледзь не ўся зборная планеты, пакуль складана. 34:30 — менавіта з такім лікам беларускі чэмпіён саступіў французам. Ужо заўтра падапечныя Барыса Дэніча правядуць другі матч турніру. У другім туры Лігі чэмпіёнаў беларусы на паркеце Палаца спорту прымуць македонскі «Вардар». Пачатак гульні ў 19:00.

5. І напрыканцы яшчэ раз пра футбол. У Гродне завяршыліся рэспубліканскія спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў па футболе «Скураны мяч» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Першае месца ў турніры заняла каманда «Нёман», якая прадстаўляла Шчучынскі раён. У галоўным матчы хлопцы з Гродзенскай вобласці перамаглі Бярэзіну» (Барысаўскі раён) 2:1.

Падрыхтаваў Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

СЯРЭБРАНЫЯ КВЕТКІ

Учора Нацыянальны банк увёў у абарачэнне тры сярэбраныя памятныя манеты серыі «Прыгажосць кветак» — «Сланечнік (Helianthus)», «Настурка (Tropaeolum)» і «Касач (Iris)», паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага банка краіны.

Манеты маюць намінал 10 рублёў, пробу сплаву 925, масу 14,14 грама, дыяметр 32 міліметры. Усе тры адчаканены на Манетным двары Польшчы якасцю «пруф». Тыраж кожнай — да 8000 штук.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ТРАКТАРЫ ТРАПІЛІ Ў АВАРЫІ

У Віцебскай вобласці ўсяго за адзін дзень адбыліся дзве аварыі з удзелам трактароў.

Паблізу вёскі Слабодка Талачынскага раёна раніцай 35-гадовы жыхар Мінска, кіруючы аўто без вадзіцельскага пасведчання, сутыкнуўся з трактарам «МТЗ».

«Жалезны конь» рухаўся ў спадарожным кірунку. Легкавік у выніку сутыкнення перакуліўся, яго кіроўца загінуў. Высветлілася, што ён быў пазбаўлены права кіраваць аўто яшчэ ў студзені бягучага года.

А дванаццатай гадзіне ночы каля вёскі Шатрова Верхнядзвінскага раёна 27-гадовы мясцовы жыхар, кіруючы без вадзіцельскага пасведчання трактарам «МТЗ», з'ехаў у кювет і перакуліўся. У выніку гэтага ДТЗ брат гора-трактарыста, малодшы за яго на два гады, загінуў. А яшчэ адна пасажырка — вучаніца 8 класа Сар'янскай сярэдняй школы — атрымала траўмы і была шпіталізавана. Аб гэтым паведамілі ў міліцэйскім ведамстве.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КОНЬ ВЫЦЯГНУЎ КАНЯ

Кемлівасць праявілі супрацоўнікі МНС Гомельскага раёна, калі выцягвалі каня з гразі. Жывёліну засмактала па шыю. Кабылу некалькі дзён таму нехта выкраў у гаспадароў з вёскі Жытоўля.

Знайшлі яе ў меліярацыйнай канаве недалёка ад населенага пункта — гаспадары ўжо і не спадзяваліся на станоўчы вынік пошукаў. Хутчэй за ўсё, у бездапаможным стане кабыла правяла больш за суткі. Дарэчы, з гразі жывёліну выратоўвалі з дапамогай... іншага каня. Пацярпелую абвязалі і вельмі асцярожна, каб не пашкодзіць, выцягнулі з пасткі, паведаміў прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС па Гомельскай вобласці Руслан Габрылёў.

Дарэчы, у выхадныя ў вёсцы Матнявічы Чачэрскага раёна давялося выратоўваць яшчэ адну жывёліну. На глыбіню каля двух метраў у гаспадарскі склеп звалілася карова. Яе супрацоўнікі МНС выцягнулі жывой і непашкоджанай з дапамогай ручной лябёдкі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВОСЕНЬСКІЯ ДАЖДЖЛІВЫЯ ДАРОГІ ПАТРАБУЮЦЬ УВАГІ

У Чавускім раёне за выхадныя дні ў ДТЗ загінулі два чалавекі

Напрыканцы дня 21 верасня, паблізу вёскі Атражжа, 41-гадовы мужчына трапіў пад колы трактара. Трактарам «МТЗ» кіраваў 17-гадовы вясковец, мужчыну ён вёз у прычэпе. Пры руху пасажыр выпаў з прычэпа і трапіў пад кола, ад атрыманых траўмаў памёр на месцы.

На наступны дзень а 6 гадзіне раніцы 34-гадовы магілёвец паблізу вёскі Вайнілы не справіўся з кіраваннем аўтамабіля «Аўдзі-100», з'ехаў у кювет і перакуліўся. У выніку здарэння вадзіцель загінуў. Ён не меў пасведчання кіроўцы.

У Магілёўскім ДАІ робяць справаздачу, што за пятніцу, суботу і нядзелю выяўлена больш за 2,5 тысячы парушэнняў правілаў дарожнага руху. У тым ліку затрымана і адхілена ад кіравання аўтамабілямі 50 нецвярозых вадзіцеляў, прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці 725 вадзіцеляў, якія перавысілі дазволеную хуткасць руху.

Ілона ІВАНОВА.

СНАРАДЫ ПРАЛЯЖАЛІ З ВАЙНЫ

Паблізу вёскі Яроміна Віцебскага раёна пры правядзенні земляных работ знайшлі 17 артылерыйскіх снарадаў і 27 узрывальнікаў да іх. Ваенныя сапёры ўстанавілі, што гэта — арсенал часоў Вялікай Айчыннай вайны. Небяспечную знаходку знішчылі.

У ЕГІПЦЯНІНА АДАБРАЛІ ДОЛАРЫ

Грамадзянін Егіпта паведаміў віцебскім міліцыянерам, што вечарам у самым цэнтры горада, на пешаходнай вуліцы Суворава, дзе так любяць гуляць турысты, у яго адабралі грошы.

Невядомы забраў у 23-гадовага іншаземца 200 тысяч рублёў і 150 долараў ЗША. Па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства быў затрыманы непрацуючы, 1970 года нараджэння. Заведзена крымінальная справа.

ПІСТОНЫ ЗАГАРЭЛІСЯ Ў КІШЭНІ ХЛОПЧЫКА

У Лепелі ў 13-**гадовага мясцовага жыхара ў кішэні штаноў загарэліся пістоны. Школьніка шпіталізавалі з тэрмічнымі апёкамі** другой **ступені правага** сцягна (**5% цела).**

Як паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, высветлілася, што гэты піратэхнічны выраб хлопчык купіў на рынку ў райцэнтры — у павільёне дзіцячых цацак. Прынёс пістоны ў школу, і на перапынку яны загарэліся.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МАСАЖ СА... СЛІМАКАМІ

Чэмпіянат Беларусі па спа-масажы і прыкладной эстэтыцы прайшоў у сталіцы. Больш за дваццаць масажыстаў рэспублікі прынялі ўдзел у спаборніцтвах, каб не толькі атрымаць званне лепшага ў краіне, а яшчэ і адправіцца на V міжнародны фестываль спа-масажу і ёгі ў Тайланд. У фінале чэмпіянату ацэньвалася высокае майстэрства, арыгінальнасць і канцэптуальнасць прапанаваных увазе спа. Напэўна, самае экзатычнае — масаж са слімакамі. Спецыялісты прадставілі ўсе галіны аздараўлення, медыцынскія цэнтры, санаторыі, салоны, лазні.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

■ «Прамая лінія»

У ЖЫВАЦЕ — І БОЛЬ, І ЦЯЖАР

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 21 верасня.)

На пытанні чытачоў «Звязды» і карыстальнікаў сайта doktora.by адказалі дацэнты 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдаты медыцынскіх навук, урачы-гастраэнтэролагі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Мікалай КАПРАЛАЎ і Ірына ШАЛАМІЦКАЯ.

СЫРАЯ АГАРОДНІНА ТОЛЬКІ НАШКОДЗІЦЬ

— Мінск, Тамара Яўгенаўна. 60 гадоў. Ультрагукавое даследаванне: печань у памеры павялічана, памер правай долі 168 мм, левай — 60 мм. Структура аднародная. Эхагеннасць трохі павышаная. Жоўцевы пузыр дакладна бачны, з пераціжкай у галіне шыйкі, камянёў няма. Заключэнне: гепатамегалія, дыфузныя змяненні ў печані і падстраўнікавай залозе. Прыкметы халецыстыту. Ці патрабуе лячэння гепатамегалія? Што азначаюць дыфузныя змяненні ў печані і падстраўнікавай залозе? Што такое «прыкметы халецыстыту»?

— Гепатамегалія — гэта не захворванне, а наступства нейкага захворвання печані. Гепатамегалія — павелічэнне печані ў памеры — характэрная для многіх захворванняў печані, у прыватнасці, для віруснага гепатыту, тлушчавага гепатозу і інш. Таксама яна часта ўзнікае пры застойнай сардэчнай недастатковасці. Асабліва значная гепатамегалія назіраецца пры лейкозах. Гепатамегалія можа назірацца пры хранічных інфекцыях, інтаксікацыях, у абясшкоджванні якіх печань іграе не апошнюю ролю, а таксама пры такіх інфекцыях, узбуджальнікі якіх могуць паразітаваць у печані, напрыклад, пры апістархозе. Гепатамегалія бывае і пры пухлінnай інфільтрацыі печані — як пры пярвічным раку печані, так і пры метастазах злаякасных пухлін іншых органаў у печань.

Што датычыцца «дыфузных змяненняў печані, падстраўнікавай залозы» і «прыкмет халецыстыту», то гэта ні пра што канкрэтна не гаворыць, а толькі паказвае на выяўленне нейкіх змяненняў у тканках або органах. Само па сабе заключэнне не з'яўляецца дыягназам. Больш за тое, яно дакладна ўказвае на тое, што ў органах не выяўлены пухліна, камяні, кісты або ачагі кровазліцця. Падобныя «знаходкі» заўсёды апісваюцца асобна.

Аднак трэба разумець, што любыя дыфузныя змяненні могуць быць як у выніку зусім нязначных прычын (напрыклад, курэнне, ужыванне алкаголю, дрэннае харчаванне і г.д.), так і з-за сур'ёзных захворванняў. У цэлым падобнае заключэнне гаворыць аб тым, што вам неабходна прайсці дадатковае, у тым ліку лабараторнае абследаванне.

— Мяне непакоіць кішэчнік. Жывот пастаянна ўспушвае, нешта там бурчыць, адчуванне перапоўненасці… Была ў гастраэнтэролага, зрабіла УГД, выявілі павялічаныя лімфавузлы ў кішэчніку. Піла два тыдні лінэкс, ела агародніну, піла больш вадкасці. Сімптомы нібыта спачатку адступілі, але потым зноў вярнуліся. Піла эспумізан. Пасля знаёмая параіла лацыдафіл. Ці варта яго прымаць? Дарэчы. гадоў пяць таму дыягнаставалі эразійны гастрыт, які лячыла дэнолам, і цяпер часам пакутую ад болю ў страўніку, пяколькі…

— Сімптомы захворвання кішэчніка, якія вы называеце — метэарызм, боль у жываце, бурчанне і пераліванне ў ім, пачуццё няпоўнага апаражнення кішэчніка — могуць быць уласцівымі для вялікай групы хвароб тонкай і тоўстай кішкі. Гэта, напрыклад, сіндром парушанага ўсмоктвання, які развіваецца пры запаленчых захворваннях тонкай кішкі, сіндром залішняга бактэрыяльнага росту ў тонкай кішцы, сіндром раздражнёнага кішэчніка і інш. Сырыя агародніна і садавіна пры гэтых захворваннях, як правіла, пагаршаюць клінічную сімптаматыку.

Дыферэнцыяльная дыягностыка гэтых захворванняў можа быць праведзена толькі метадамі лабараторных і інструментальных даследаванняў: эндаскапічным даследаваннем кішэчніка, пасажам барыю па кішэчніку (рэнтгеналагічны метад), даследаваннем відавога і колькаснага складу мікробнай флоры, даследаваннем кала, у тым ліку на прасцейшыя, яйкі гельмінтаў і інш. На наш погляд, вам патрабуецца паўторны візіт да гастраэнтэролага для вырашэння пытанняў даабследавання і далейшага лячэння.

ТЭРАПІЯ НЕАБХОДНА Ў ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ

— Мне 46 гадоў. У дзяцінстве хварэла на Боткіна. Баліць шыя і аддае ў плячо. Фібрагастрадуадэнаскапія паказала: язва страўніка, хранічны антральны атрафічна-гіперпластычны гастрыт. Запаленне +++, актыўнасць -. У цыталогіі НР не выявілі, а ў гісталогіі НР +++. Лейкацыты, праліферацыя клетак эпітэлію слізістай абалонкі страўніка. Застойная дуадэнапатыя. Постязвавая дуадэнальная дэфармацыя, эрытаматозная гастрапатыя 2–3 ст. Нязначная атрафія слізістай абалонкі страўніка. Прапанавалі правесці эрадыкацыю. Схема з амезам, дэ-нолам, клацыдам і трыхапалам. Тры дні піла амез і дэ-нол. Антыбіётыкі прапіла толькі 2 дні: з'явілася тахікардыя, узняўся ціск. Лекі піць перастала. Пасля адмены была кіслая сліна. Абследавалася. Кроў, мача, УГД — у норме. Паступова з'явілася слабасць, страціла некалькі кілаграмаў. Непрыемныя адчуванні ў страўніку і кішэчніку, адчуванне, што «забілі» кіслотнасць. Гастраэнтэролаг прапісаў пантасан, біфавал, крэон, дзюспаталін і мінеральную ваду «Баржомі». У мяне пэўныя сумненні адносна пантасану, які зніжае кіслотнасць. Як я зразумела, кіслотнасць у мяне пасля дэ-нолу і амезу знізілася. Куды ж болей? Адначасова па гінекалогіі прапісалі свечкі і біяфлор. Выпіла адзін раз біяфлор, і быў боль у страўніку. Ці трэба зніжаць кіслотнасць пантасанам пры атрафічным гастрыце? Ці можа мой стан кішэчніка даваць такі стан арганізма — слабасць, тэмпературу 37 градусаў, знясіленне?

— Атрафічны гастрыт — не прыкмета паніжанай кіслотнасці страўнікавага соку. Атрафію клетак можа выклікаць і інвазія бактэрый. Пры наяўнасці хелікабактарнай інфекцыі кіслотная прадукцыя страўніка, як правіла, павышаная. Галоўным прынцыпам лячэння хранічнага гастрыту, звязанага з хелікабактарнай інфекцыяй, з'яўляецца эрадыкацыя, або знішчэнне бактэрыі. Сапраўды, у часткі хворых падчас прыёму антыбактэрыяльных прэпаратаў адзначаюцца пабочныя эфекты, якія падчас лячэння паступова нівеліруюцца. Такім чынам, эрадыкацыйную тэрапію трыма прэпаратамі, рэкамендаваную вам, неабходна правесці ў поўным аб'ёме. Пры атрафічным гастрыце, асацыяваным з хелікабактарнай інфекцыяй, мы прызначаем антысакраторныя прэпараты, у тым ліку і лекавы сродак з групы пантапразолу.

Акрамя таго, каб абследаваць вас на выяўленне паталогіі кішэчніка, неабходна правесці шэраг лабараторных і інструментальных даследаванняў: эндаскапічнае даследаванне кішэчніка, пасаж барыю па кішэчніку (рэнтгеналагічны метад), даследаванне відавога і колькаснага складу мікробнай флоры, даследаванне кала, у тым ліку на прасцейшыя, яйкі гельмінтаў і інш.

Улічваючы боль у шыі з ірадыяцыяй у плячо, вам мэтазгодна выканаць рэнтгеналагічнае даследаванне шыйнага аддзела пазваночніка.

— Пакутую ад моцнага болю ў правым падрабрынні. Пройдзены курс лячэння: ліў-52, халензім, эсенцыяле, жоўцевы збор, панзінорм, дыета. Білірубін 12,6, АсАТ 28, АлАТ 20, халестэрын 4,92, глюкоза 4,59...

— Інтэнсіўны боль у правым падрабрынні можа быць звязаны з шэрагам захворванняў жоўцевага пузыра і жоўцевыводных шляхоў. Перш за ўсё, гэта жоўцекаменная хвароба, дысфункцыя жоўцевага пузыра па гіперкінетычным тыпе і г.д. Улічваючы вынікі біяхімічнага аналізу крыві, размовы пра пашкоджанне печані ісці не можа. Мэтазгодна ўважліва вывучыць характар болю (працягласць, правакуючы фактар, спосаб купіравання). Зрабіць ультрагукавое даследаванне з кантраставаннем жоўцевага пузыра, правесці гастрадуадэнаскапію. Варта памятаць, што болевыя адчуванні ў правым падрабрынні ў некаторых выпадках могуць быць звязаны з астэахандрозам пазваночніка ў грудным аддзеле.

Для зніжэння масы цела часцей за ўсё выкарыстоўваецца сутачны рацыён, энергетычная каштоўнасць якога роўная 1700–1800 ккал (у норме для здаровага чалавека — 3000–3200 ккал). Акрамя змяншэння тлушчу, вугляводаў, выдалення рафінаваных прадуктаў, абмяжоўваецца ўжыванне хлеба да 100–150 г у суткі. Ежу гатуюць без солі. Можна выкарыстоўваць толькі 3–6 г у суткі для падсольвання гатовых страў. Харчаванне павінна быць дробным, невялікімі порцыямі, 4–6 разоў у дзень. Паміж асноўнымі прыёмамі ежы можна ўжываць невялікую колькасць малакаларыйных прадуктаў — яблыкі, абястлушчаны тварог, салаты з гароднiны без алею і інш. Зніжэнне масы цела павінна быць не хуткім і складаць 3–4 кг у месяц.

Лячэбнае галаданне, або разгрузачныя дні, пры атлусценні малаэфектыўныя, пакольки пасля галадання маса цела зноў хутка вяртаецца.

Фізічная актыўнасць, або лячэбная фізкультура — абавязковы складнік лячэбнага комплексу. Від фізічных практыкаванняў, іх аб'ём і тэмп, інтэнсіўнасць нагрузкі ў многім залежыць ад ступені атлусцення, спадарожных захворванняў, узросту, фізічнай падрыхтоўкі. Але ў любым выпадку фізічная нагрузка павінна быць актывізавана. Канкрэтнае рашэнне гэтага і іншых пытанняў, звязаных з лячэннем атлусцення, можна атрымаць у гарадской або раённай паліклініцы па месцы жыхарства ва ўрача-тэрапеўта.

Атлусценне развіваецца пры залішняй каларыйнасці ежы, галоўным чынам, за кошт жывёльнага тлушчу і вугляводаў, а таксама з-за парушэння рэжыму харчавання — прыёму асноўнай долі сутачнага рацыёну ў вячэрнія гадзіны.

ЛЯЧЫЦЕ АТЛУСЦЕННЕ КОМПЛЕКСНА

— 25 гадоў. Пакутую ад лішняй вагі. Хачу паставіць інтрагастральны балон. Хацелася б больш даведацца пра гэтую працэдуру. Што для гэтага патрэбна?

— Атлусценне развіваецца пры залішняй каларыйнасці ежы, галоўным чынам, за кошт жывёльнага тлушчу і вугляводаў, а таксама з-за парушэння рэжыму харчавання — прыёму асноўнай долі сутачнага рацыёну ў вячэрнія гадзіны. Акрамя таго, лішняя вага фарміруецца пры значным абмежаванні фізічнай актыўнасці нават пры невысокай каларыйнасці ежы. Важнае значэнне мае і спадчынны фактар, нярэдка атлусценне носіць сямейны характар. З павелічэннем вагі з'яўляюцца стамляльнасць, слабасць, апатыя, задышка, санлівасць, павышаецца апетыт. Рана развіваюцца захворванні сэрца, атэрасклероз, хваробы печані, эндакрынныя расстройствы, паталогія суставаў і пазваночніка.

Лячэнне атлусцення заўсёды комплекснае. Яго мэта — стварэнне ў арганізме адмоўнага энергетычнага балансу шляхам рэзкага абмежавання каларыйнасці ежы, перш за ўсё, за кошт змяншэння паступлення жывёльнага тлушчу і вугляводаў, асабліва рафінаваных — цукар, мёд, кандытарскія вырабы.

Атрымаць у гарадской або раённай паліклініцы па месцы жыхарства ва ўрача-тэрапеўта.

Варта, аднак, памятаць, што атлусценне можа быць і другасным, звязаным з захворваннямі, перш за ўсё, эндакрыннай сістэмы. Таму абследаванне перад пачаткам лячэння атлусцення ва ўрача павінна быць абавязковым. Існуюць розныя метады аператыўнага лячэння атлусцення, у тым ліку ўвядзенне ў прасць страўніка чужароднага прадмета — інтрагастральнага балона. Пры завяршэнні курса лячэння балон неабходна выдаліць. Метад мае на ўвазе, вядома, дадатковыя матэрыяльныя затраты.

У гэтым адказе мы адлюстроўваем агульнапрынятыя, навукова абгрунтаваныя падыходы да вырашэння пытання лішняй вагі. Менавіта на іх мы і раім звярнуць увагу. Кожнаму пацыенту з атлусценнем неабходна праявіць падчас лячэння характар, волю і настойлівасць. Тады вынік будзе дасягнуты.

ПАСЛЯ ПЕРШАГА ЭФЕКТУ НЕ АДМАЎЛЯЙЦЕСЯ АД ЛЕКАЎ

— 22 гады. Гастрыт з 12 гадоў. Зараз моцнае пагаршэнне. Пастаянна ванітуе, перыядычна — пякотка, боль уверсе жывата. Вынік даследавання: дуадэнагастральны рэфлюкс, недастатковасць кардыі, эразіўная гастрапатыя, эрытыматозная дуадэнапатыя 1 ступені запалення. Ці можна гэта лячыць? Піла матыліум і амепразол. На той час ванітаванне знікла, аднак па завяршэнні прыёму вярнулася. Дыету вытрымліваю. Не куру, не ўжываю алкаголь.

— Сімптомы вашага захворвання — пякотка, боль у падлыжачнай частцы, ванітаванне і эндаскапічныя даныя ўказваюць на наяўнасць гастраэзафагеяльнай рэфлюкснай хваробы, дуадэнагастральнага рэфлюксу і хранічнага гастрыту з эрозіямі. Вы прымалі адэкватную медыкаментозную тэрапію. Даволі частая памылка пры лячэнні — хуткае адмаўленне ад антысакраторнай тэрапіі пры атрыманні першага эфекту. Лячэнне павінна быць працяглым — 2–4 месяцы з пераходам на падтрымальную, палавінную курсавой дозу амепразолу.

— У сына, яму 19 гадоў, год таму падчас эндаскапіі страўніка выявілі паліп 0,3х0,4 см страваводу ў раёне кардыі, узялі біяпсію, нічога анкалагічнага не знайшлі. Далі накіраванне ў Мінскую абласную бальніцу на кансультацыю. У бальніцы пацвердзілі дыягназ — паліп кардыі — і ў рэкамендацыях напісалі «назіранне ў гастраэнтэролага». Праз год сын зноў прайшоў абследаванне ў эндаскапіста: паліп застаўся тых жа памераў, што і быў. Ці ёсць небяспека перараджэння паліпа?

— Паліп — гэта пухліна, якая звісае са сценкі полага органа ў яго прасвет. Паліп адносіцца да групы перадракавых захворванняў. Лячэнне паліпаў стрававода аператыўнае. Гэта звязана як з магчымасцю перараджэння ў рак, з'яўленнем язвы на паліпе, небяспекай кровацякання, так і з магчымасцю асфіксіі, асабліва пры наяўнасці доўгай ножкі ў паліпа, і абцяжарваннем праходжання цвёрдай ежы па стрававадзе.

Апошнім часам сярод метадаў аператыўнага выдалення паліпаў стрававода найбольшае прызнанне атрымлівае электраэксцызія паліпа праз эндаскоп. Можна таксама выдаляць паліпы стрававода праз эзафагаскоп шляхам перасячэння ножкі паліпа спецыяльнымі нажніцамі або дротавай пятлёй. Пры гэтым неабходна памятаць аб магчымай перфарацыі (разрыве, пашкоджанні) стрававода, асабліва пры моцным нацяжэнні ножкі. Гэту маніпуляцыю трэба выконваць з вялікай асцярожнасцю. У выпадку немагчымасці паліпэктаміі праз эндаскоп і пры наяўнасці вялікіх паліпаў на шырокай аснове паказана эзафагатамія (рассяканне стрававода) пасля папярэдняй біяпсіі і выключэння злаякаснага характару пухліны. Паліп на шырокай аснове выдаляюць у межах здаровых тканак і зашываюць дэфект слізістай абалонкі.

ЗНІЖАЙЦЕ КАЛАРЫЙНАСЦЬ, ПАВЫШАЙЦЕ АКТЫЎНАСЦЬ

— 26 гадоў. Пасля двух родаў набрала 20 кг. Пакуль не магу іх скінуць. Дапамажыце скласці меню, па якім можна харчавацца, каб прывесці сябе ў форму. Падкажыце аптымальны рэжым харчавання, памер порцый. Ці можна дадаць разгрузачны дзень?

— Меню можа і павінна быць як мага больш разнастайным. Важна звярнуць увагу на іншыя моманты. Існуюць агульнапрынятыя, навукова абгрунтаваныя падыходы да вырашэння пытання лішняй вагі.

У першую чаргу неабходна істотна абмежаваць каларыйнасць ежы, зменшыць паступленне жывёльнага тлушчу і вугляводаў. Харчаванне павінна быць дробным, 4–6 разоў у дзень. Паміж асноўнымі прыёмамі ежы можна ўжываць невялікую колькасць малакаларыйных прадуктаў. Лячэбнае галаданне, разгрузачныя дні пры атлусценні малаэфектыўныя, пакольки пасля галадання маса цела зноў хутка вяртаецца.

Фізічная актыўнасць, або лячэбная фізкультура — абавязковы складнік лячэбнага комплексу.

— 39 гадоў. Паўтара года таму нарадзіла. З 18 да 37 гадоў мая вага не перавышала 50 кг. Калі зацяжарала, то ўжо за першыя два месяцы набрала каля 7 кг. Да родаў вага павялічылася на 22 кг. Зараз вага роўная 70 кг. Каля года спрабую зменшыць вагу, аднак нічога пакуль не атрымліваецца. Да родаў нічога, акрамя эразійнага гастрыту, у мяне не знаходзілі. З чаго трэба пачаць? Ці можна абследавацца ў раённай паліклініцы або з такімі праблемамі трэба звяртацца толькі ў спецыялізаваныя клінікі?

— Варта мець на ўвазе, што лішняя вага, праблема атлусцення можа быць звязана з іншым захворваннем, перш за ўсё, эндакрыннай сістэмы. Таму перад пачаткам вырашэння праблемы зніжэння вагі абавязкова трэба абследавацца. Канкрэтнае рашэнне пытанняў, звязаных з лячэннем атлусцення, можна атрымаць у гарадской або раённай паліклініцы па месцы жыхарства ва ўрача-тэрапеўта.

— Пасля тлустай ежы моцна ацякаюць вочы. Фібрагастрадуадэнаскапія і каланаскапія ніякай паталогіі не выявілі. Ультрагук брушной поласці, шчытападобнай залозы ў норме. Аналізы крыві добрыя. Пасля 18.00 есці наогул не магу, бо раніцай будзе ацёчнасць. Скінула 12 кг. Восенню становіцца так дрэнна, што ўвесь дзень магу ўжываць толькі аўсянку. Часта пасля ежы баліць злева пад рэбрамі. Што рабіць?

— Найбольш верагодна, што ў вас мае месца харчовая алергія на адзін ці некалькі прадуктаў. Так званы «алергічны параарбітальны ацёк» развіваецца хутка і раптоўна. Ацёк можа распаўсюджвацца пры гэтым на іншыя часткі твару і цела. Працягласць ацёку — ад некалькіх гадзін да 2–3 сутак. Акрамя таго, ацёкі на твары могуць з'яўляцца пры захворваннях нырак, эндакрынных расстройствах, хваробах злучальнай тканкі і інш. Вам неабходна звярнуцца ў паліклініку да тэрапеўта або алерголага.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

Міністр адукацыі і навукі Арменіі Армен АШАЦЯН:

«САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — НЕ СТРАЦІЦЬ СВАЮ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ»

«Балонскі працэс — гэта скарбонка ідэй, з якой трэба браць толькі тое, што падыходзіць канкрэтнай краіне», — заявіў падчас свайго візіту ў Беларусь міністр адукацыі і навукі Рэспублікі Арменія Армен Ашацян.

Армен Ашацян і Сяргей Маскевіч наведваюць гімназію ў Нясвіжы.

Фота БЕЛТА

Трэба нагадаць, што Беларусь падавала заяўку на далучэнне да Балонскага працэсу, але летась наша заяўка не была задаволена. Наступная ж магчымасць з'явіцца толькі ў 2015 годзе. Да 2015 года ў Балонскім працэсе старшынствуе менавіта Рэспубліка Арменія, і наша заяўка праз два гады будзе разглядацца ў Ерэване. Натуральна, што на прэс-канферэнцыі, якую Армен Ашацян правёў сумесна са сваім беларускім калегам — міністрам адукацыі нашай краіны Сяргеем Маскевічам — журналісты папрасілі падзяліцца кіраўніка сістэмы адукацыі Арменіі яго бачаннем тых працэсаў, што адбываюцца на еўрапейскай адукацыйнай прасторы.

Рэфармаванне адукацыі — працэс бесперапынны?

— Нягледзячы на тую акалічнасць, што Рэспубліка Арменія далучылася да Балонскага працэсу яшчэ ў 2005 годзе, рэфармаванне вышэйшай школы ўсё яшчэ працягваецца. Хачу заўважыць, што наша грамадскасць вельмі ўважліва сочыць за ўсімі рэформамі, што адбываюцца ў сістэме адукацыі, — падкрэсліў Армен Ашацян. — Адукацыя — тая сфера, якая закранае, напэўна, кожную сям'ю, таму цяжка знайсці людзей, якія знаходзяцца па-за нашымі рэформамі. І скажу шчыра, магчыма, наша грамадскасць ужо стамілася ад рэформ у сферы адукацыі. Але калі ў мяне пытаюцца «А калі ж закончыцца рэфармаванне адукацыі?», то я сумленна адказваю: «Ніколі…» Таму што роля адукацыі заключаецца ў стымуляванні эканамічнага і грамадскага развіцця краіны і асобы, а гэта развіццё ніколі не можа спыніцца. Таму пастаянна развіваецца і абнаўляецца і сістэма адукацыі…

Сёння і свет, і Еўропа прапануюць вялікія магчымасці, аднак, рухаючыся ў рэчышчы інтэграцыйных працэсаў, важна не страціць сваю нацыянальную ідэнтычнасць. І ні ў якім разе ўступленне краіны ў Балонскі працэс нельга разглядаць выключна як магчымасць атрымаць дыплом еўрапейскага ўзору…

Арменія перайшла на трохступенчатую сістэму вышэйшай школы: навучанне ў бакалаўрыяце доўжыцца ад трох да чатырох гадоў (пераважна чатыры гады), у магістратуры — адзін-два гады (пераважна два) і тры гады — у аспірантуры. Мы ўвялі сістэму назапашвання і трансферу крэдытаў, інстытуты кантролю якасці, пераарыентавалі нашы вучэбныя праграмы на модульнасць. Пашыраецца аўтаномія студэнтаў і іх удзел у працэсе прыняцця рашэнняў на ўзроўні ВНУ. Разам з тым мы сутыкнуліся і з шэрагам праблем.

Калі казаць пра нашы памылкі, то трэба канстатаваць, што пры пераходзе да бакалаўрыяту і магістратуры многія ВНУ проста механічна «запіхнулі» пяцігадовую праграму па падрыхтоўцы дыпламаваных спецыялістаў у чатыры гады. І што ў выніку атрымалася? У бакалаўрыяце вельмі насычаная вучэбная праграма, а магістранты скардзяцца, што ім не хапае новага матэрыялу, таму фактычна адбываецца паўтарэнне пройдзенага. Новага адукацыйнага кантэнту для магістратуры створана не было. Таму патрабуецца пераразмеркаванне адукацыйнай праграмы паміж бакалаўрыятам і магістратурай. Да таго ж са ступенню бакалаўра ў нас няма пакуль канкрэтнага выхаду на рынак працы. Таму я лічу, што сістэму адукацыі трэба рэфармаваць, зыходзячы з патрэб эканомікі канкрэтнай дзяржавы. Не трэба ўсё слепа пераймаць. А набываючы новае, нельга страчваць лепшае з таго, што было.

У 90-я гады і на мяжы стагоддзяў у Арменіі налічвалася 90 прыватных ВНУ. Сёння ж іх колькасць зменшылася да трыццаці. Частку прыватных ВНУ закрылі мы, а частка — закрыліся самі, пакольки не вытрымалі жорсткай канкурэнцыі. І мы лічым, што і гэтая лічба яшчэ не апошняя: выжывуць толькі тыя ВНУ, якія акажуцца канкурэндазольнымі і будуць даваць студэнтам якасную адукацыю.

Суадносіны бюджэтнай і платнай формы навучання ў Арменіі 20 да 80. У выпускнікоў, якія здаюць нешта накшталт адзінага дзяржаўнага экзамену ў цэнтрах тэсціравання, ёсць магчымасць абмежавацца заданнямі з часткі А, каб атрымаць школьны атэстат, або падумаць над заданнямі з часткі В, калі яны мараць пра вышэйшую адукацыю. Дарэчы, толькі 50% выпускнікоў армянскіх школ ідуць атрымліваць вышэйшую адукацыю. **Затое ў прэтэндэнтаў на вышэйшую адукацыю ёсць магчымасць указваць адразу 10 ВНУ або 10 прыярытэтных спецыяльнасцяў, дзе яны былі б не супраць навучацца.** Праўда, пасля завяршэння «экзаменацыйнай буры» далёка не заўсёды абітурыенты «асядаюць» там, дзе ім і сапраўды цікава. Яны не заўсёды матываваныя, каб стаць спецыялістам у пэўнай галіне, а калі няма асабістай матывацыі, то тут ніякія адміністрацыйныя метады не дапамогуць.

Калі мы жадаем быць часткай глабальнай адукацыйнай прасторы, то не трэба рабіць сцэны рэўнасці з-за таго, што хтосьці рэалізуе сваё права атрымліваць адукацыю за мяжой.

На першы, другі, трэці — разлічыся

Адказваючы на пытанне журналіста «Звязды», як у Арменіі ставяцца да прысутнасці іх ВНУ у сусветных рэйтынгах, Армен Ашацян паведаміў наступнае:

— Мы распрацавалі свой нацыянальны рэйтынг, вядома, без прэтэнзіі на Нобелеўскую прэмію. Натуральна, што нам вельмі хацелася б бачыць свае ВНУ ў Шанхайскім ці Таймсаўскім рэйтынгу, але я цудоўна разумею, што яны пакуль не для нас. Не буду таіць, што, апелюючы такімі выдатнымі фактамі, можна было б «закрыць рот» усім нашым апанентам, але для павышэння якасці адукацыі ў нас яшчэ вельмі вялікі фронт работ. Да таго ж і бюджэты армянскіх ВНУ зусім не такія, як у лідараў сусветных рэйтынгаў. Прызнаюся, у нас ёсць мэта — да 2017 года пяць армянскіх ВНУ павінны прайсці міжнародную акрэдытацыю ў вядомых еўрапейскіх ці амерыканскіх агенцтвах. І ў нас ужо ёсць дзве ВНУ з міжнароднай акрэдытацыяй, значыць, у бліжэйшыя чатыры гады трэба, каб яшчэ тры ВНУ пацвердзілі якасць сваёй работы на міжнародным узроўні.

Першая публікацыя нацыянальнага рэйтынгу армянскіх ВНУ запланавана на 2014 год. На думку міністра, рэйтынг — вельмі важны інструмент, які дае абітурыентам і іх бацькам дакладную і аб'ектыўную інфармацыю аб якасці адукацыі ў той ці іншай ВНУ. Аргументы кшталту «тут бяруць хабар, а там — не» больш пад увагу брацца не будуць. Рэйтынг робіць вышэйшую школу больш празрыстай і справаздачнай перад грамадствам і адначасова стымулюе канкурэнцыю паміж ВНУ.

Не падстава для рэўнасці…

Армен Ашацян звярнуў увагу журналістаў, як ён зазначыў, на відавочны парадокс:

— Калі сістэма адукацыі краіны рэфармуецца і пачынае расці ў сваёй якасці, калі супадаюць кваліфікацыі і прызнаюцца дыпломы, калі мабільнасць студэнтаў заахвочваецца, усё большая колькасць маладых людзей выкарыстоўваюць магчымасць выехаць за мяжу, у тым ліку і для атрымання там адукацыі. Нашы апаненты сцвярджаюць, што адукацыя ў нас быццам бы дрэнная. Але як у такім разе нашы грамадзяне сотнямі едуць атрымліваць адукацыю ў еўрапейскія і амерыканскія ВНУ? Дарэчы, толькі ў ТОП-10 лепшых універсітэтаў свету едуць штогод навучацца прыблізна каля 150 чалавек, і дзяржава субсідзіруе іх адукацыю. Яшчэ прыблізна 600–700 чалавек выязджаюць вучыцца па іншых стыпендыяльных праграмах. Мушу канстатаваць: крыўдна, калі краіну пакідаюць маладыя людзі, але, з іншага боку, калі мы хочам быць часткай глабальнай адукацыйнай прасторы, то не трэба рабіць сцэны рэўнасці з-за таго, што хтосьці рэалізуе сваё права атрымліваць адукацыю за мяжой. Я асабіста вельмі спадзяюся, што нашы маладыя людзі, атрымаўшы за мяжой высакакласную адукацыю, нават калі і не вернуцца на радзіму, а застануцца працаваць у Бостане ці Чыкага і стануць выдатнымі фізікамі-ядзершчыкамі (а падобных умоў мы ім пакуль у Арменіі стварыць не можам), усё роўна будуць для сваёй радзімы карыснымі. Лепш працаваць і падтрымліваць з імі сувязь у канцэпцыі армянскага свету.

Стаўка ў школе — на шахматы!

Трэба зазначыць, што візіт армянскай дэлегацыі ў Беларусь аказаўся вельмі насычаным. Госці з Арменіі паспелі азнаёміцца з работай БДУ, БДУІР і Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Наведалі дзіцячы садок № 4 у Нясвіжы, Нясвіжскую гімназію, дзе іх увазе быў прадстаўлены вопыт работы ў Мінскай вобласці школьных бізнес-кампаній, а таксама Каледж перапрацоўчай прамысловасці ў Слуцку.

— Асабліва мы ўражаны выхаваўчым аспектам у вашай сістэме адукацыі, вашай работай з дзецьмі па патрыятычным выхаванні, рэалізацыяй бізнес-праектаў, работай з кадэцкімі класамі, — прызнаўся Армен Ашацян. — Дарэчы, і нам ёсць чым падзяліцца. Арменія — адзіная краіна ў свеце, якая ўвяла ў школе шахматы як абавязковы прадмет. Ён выкладаецца школьнікам з другога па чацвёрты класы. Гэта — нацыянальны адукацыйны прадукт, які мы стварылі разам з Шахматнай акадэміяй. Нам удалося даказаць, што вывучэнне шахматнай гульні стымулюе ў дзяцей крэатыўнасць, лагічнае мысленне, стратэгічнае планаванне, спрыяе фарміраванню асобы, якая ведае, што такое перамога і што такое паражэнне. Лідарскія якасці, якія фарміруюцца ў дзяцей, уменне несці адказнасць за свае рашэнні спатрэбяцца ім не толькі ў шахматах, але і ў вучобе, і ў далейшым жыцці. Да таго ж праз вывучэнне шахмат мы змаглі дабіцца паляпшэння паспяховасці і па іншых прадметах, у тым ліку па матэматыцы.

Арменія далучылася да міжнароднага параўнальнага маніторынгавага даследавання матэматычнай і прыродазнаўчанавуковай адукацыі школьнікаў TIMSS.

— Па выніках апошняга даследавання нашы васьмікласнікі прадэманстравалі такі ж узровень ведаў па матэматыцы, як іх равеснікі з Нарвегіі. Але калі ўлічыць, што ў Нарвегіі на аднаго школьніка выдаткоўваецца ў шэсць разоў больш сродкаў, чым у Арменіі, то мы вельмі задаволены сваёй пазіцыяй у міжнародным рэйтынгу, — зазначыў Армен Ашацян.

Надзея НІКАЛАЕВА.

г. Нясвіж.

■ Традыцыі

УСЯГО БАГАТА

ТАКОГА АБРАДУ НЯМА Ў СУСЕДНІХ НАРОДАЎ!..

У народзе лічылася, калі на Багач добрае надвор'е — значыць, і восень будзе цёплая. Сёлета святліла сонейка, а ў паветры павольна лёталі серабрыстыя павуцінкі. Такое цудоўнае надвор'е 21 верасня стала добрай нагодай, каб наведаць Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы ў Вязынцы, дзе Студэнцкае этнаграфічнае таварыства зладзіла восеньскі фестываль Багач.

…Па дарозе да музея расцягнуліся людзі ў народных строях. «Сёння, мабыць, нейкае свята?» — спытаў адзін з пасажыраў электрычкі. «Багач»,— з усмешкаю адказалі дзяўчаты ў ільняных кашулях.

Гасцей свята сустракалі сябры Студэнцкага этнаграфічнага таварыства ды прапаноўвалі тым, хто не захапіў з сабою жменьку зерня, маленькія «багачыкі» з жытам, пшаніцай ці аўсом. Але многія, у каго былі «запасы», набылі сабе і гэтыя палатняныя мяшэчкі з прыгожымі лінарытамі Тамары Дзяменцьевай.

На дудачны найгрыш Яўгена Барышнікава да сцэнічнай пляцоўкі падыходзілі гледачы і выступоўцы — пачынаўся галоўны абрад свята… Усе прысутныя ссыпалі зерне ў лубок з падпаленай свечкай — і з агульным «багачом» абышлі ўвесь двор музея, спяваючы жніўныя песні. Потым яго аддалі гаспадыні, каб тая паставіла «багач» на покуць і захавала да наступнага года — гэта прынясе ў яе дом багацце ды шчасце.

На Багач нашы продкі падводзілі вынікі сваёй летняй дзейнасці. «Багач, што ўсяго багата… Гаспадар падлічвае свае скарбы: што сабраў з поля, што ў агародзе вырасла»,— кажа Ганаэфа Маркевіч з вёскі Збрашкі Шчучынскага раёна. Да гэтага свята завяршалі ўсе работы ў полі, стараліся пачысціць і схаваць да вясны земляробчы інвентар, які называўся «рагачом». У народзе казалі: «Прыйшоў багач — кідай рагач, бяры сявеньку — сей памаленьку». «Багачом» называлі таксама кошык ці лубок з жытам і свечкаю, з якім абыходзілі ўсе двары ў вёсцы.

Гаспадары падлічвалі свае скарбы.

«Багач» будзе стаяць на покуці.

Пасля завяршэння гэтага старадаўняга абраду госці музея пачулі традыцыйныя жніўныя і восеньскія спевы. Першым выступіў гурт «Горынь» (дарэчы, так на Беларусі называюць адмысловыя чырвоныя ніткі для вышыўкі). Потым сцэнічную пляцоўку занялі спявачкі з вёскі Студзераўшчына Дзятлаўскага раёна. Задорная песня «Выйшла замуж маладою» настолькі спадабалася гледачам, што гурт папрасілі праспяваць і па-за сцэнай. Першую частку спеваў завяршылі гурты «Варган» і Guda.

Яшчэ а дванаццатай гадзіне на тэрыторыі музея разгарнуўся кірмаш традыцыйных рамёстваў — можна было набыць вырабы з саломы і лазы, дзеткам вельмі спадабаліся гліняныя свістулькі. Сямейная майстэрня «Поўня» парадавала прысмакамі ды «мядовым бодзі-артам». Падчас перапынку можна было паўдзельнічаць у майстар-класах па ткацтве паясоў, лозапляценні, кавальстве, навучыцца рабіць беларускую ляльку ды плесці вянкі з восеньскіх лістоў. А сямейны клуб Студэнцкага этнаграфічнага таварыства падрыхтаваў для дзетак гульнявую пляцоўку. Не забыліся сябры СЭТ і на гастранамічную праграму: на свяце можна было пакаштаваць стравы традыцыйнай беларускай кухні — напрыклад, з'есці праснак ды выпіць духмянага крупніку.

Пасля таго як госці падсілкаваліся, да сцэнічнай пляцоўкі іх запрасіў гук дуды — праграму працягнулі традыцыйныя мужчынскія спевы. Гурт хлопцаў, якія толькі нядаўна пачалі збірацца, каб спяваць, выйшаў пакуль без назвы. У гурце «Рада» аб'ядналіся людзі з глыбокай цікавасцю да беларускай традыцыі, хоць і не звязаныя з этнаграфіяй і культуралогіяй прафесійна. Завяршыў песенную частку фестывалю Раман Яраш з палескай песняй, якую ён выканаў пад гітару. Пасля запрошаныя музыкі зайгралі жвавыя беларускія песні — і перад сцэнай утварылася танцавальная пляцоўка… А «Багач» будзе стаяць на покуці да новага багатага ўраджаю!

Юлія КІРЭЙЧЫК, фота аўтара

■ Погляд

ДЗЕНЬ ПАЧАТКУ,

альбо Калі Скарына выдаў першую кнігу?

Дзень свята беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання, пачатага Георгіем Скарынам (доктарам Францыскам) «У старомъ Мєстє Празъскомъ Лѣта По нарожєнию Г[о]с[по]да їс[уса] Хр[и]ста Сына Божиѧ, Изъ прєчистыѧ Дєвици матєри божиѧ Марии Тысєщьного Пѧтьсотого И сєдьмаго на дєсєтъ М[є]с[є]ца Сєп]тєвриѧ днѧ Дєсѧтого ⁝» або 23 верасня (10-га — па старым стылі).

Гэта была кніга «Святога Іава» аб пакутах і выратаванні легендарнага персанажа. Яна як гімн унутранаму пазнанню Бога і пахвала прамудрасці Божай была выбрана Скарынам з кананічнага шэрагу кніг Бібліі з-за глыбокага рэлігійна-філасофскага зместу, які сфарміраваўся яшчэ ў дабіблейскія патрыярхальныя часы. Пра гэта сведчыць той факт, што персанажы Іаў і яго сябры (на гравюры злева направа Софар-Софаръ Нааманитъский, Вілдад-Валъдафъ Сухемъскый і Еліфаз-Елифасъ Θєманитъский) карыстаюцца словамі «Бог» і «Усемагутны», у той час як аўтар запісанага ці то ў часы Майсея, ці то Саламона кананічнага тэксту, карыстаецца іменем «Яхве». Гаспод выпрабоўвае веру Іава, і «Дияволъ з допущєния Божия погубил всє имєние єго • И чада єго ⁝» Сябры і жонка шматпакутнага Іава заклікаюць яго спраўдзіць прадказанні Сатаны, што ён служыць Богу выключна дзеля свайго дабрабыту і нарэшце пазбавіцца пакут (у сюжэце гравюры Д'ябал бічуе пакутніка). «Пахулі Бога і пампы (Іаў 2, 9), — заклікае яна. — Ён прыбярэ цябе і скончацца твае мучэнні». Аднак змест кнігі не ў асэнсаванні іх праведнікам, а ў глыбокім даследаванні духоўнага развіцця чалавека на шляху Богапазнання — магістральнай тэмы Скарынавага асветніцтва: «Перацярпеўшы да канца — выратуецца».

На некаторых экзэмплярах гэтай і другіх ранніх кніг ёсць інтэрпаляцыі ад рукі аб удзеле ў іх выданні Багдана Вонкава: «А накладомъ Богдановымъ Онковымъ зъ Вилєнского мѣста», — і з некаторымі дабаўленнямі ў пазнейшай рэдакцыі, у тым ліку і на «Псалтыры»: «А то сѧ стало накладомъ Богдана Онкова [сына] радци мѣ[є]ста Вилєнского».

Як цьмянае ўсведамленне часу з'яўлення яе ў корпусе «Пісанняў», так і дата выдання Скарынам яе перакладу, не асэнсоўваецца карэктна.

«Все врут календари» — сакраментальная фраза Фамусава з камедыі А.С.Грыбаедава «Гора ад розуму», прыдатная для нашай тэмы менавіта таму, што апісвае заблытанае становішча з датаваннем першадрукаў Скарыны́ акадэмічным досціпам, які лічыў і лічыць, што першым выдаваўся «Псалтыр» 6 жніўня 1517 года, а не «Іаў» 10 верасня 1517 года. Гісторыкі кан'юнктурна папраўляюць храналогію падзей дзеля таго, каб паказаць Скарынаву «прагрэсіўнасць» і заходнееўрапейскую арыентаванасць на навуку. Каляндар выхаду яго палеатыпаў трактуецца такім чынам, што кнігі, выдадзеныя з верасня ўключна па снежань кожнага года паводле вераснёвага стылю года (ад верасня да жніўня) памылкова ставяцца не папарадзе, а пасля астатніх, надрукаваных у тым жа годзе. Адбываецца гэта з-за таго, што яны штучна пераносяцца з вераснёвага ў студзеньскі стыль календара (ад студзеня па снежань). Так, кнігі верасня, замест таго, каб узначальваць ліст выданняў года, выпіхваюцца ў канец яго. І яшчэ адна асаблівасць: калі суаднесці дату 10 верасня 1517 вераснёвага стылю года з студзеньскім стылем календара, то яна будзе адпавядаць яшчэ не закончанаму 1516 году.

У энцыклапедычным артыкуле «Каляндар» значыцца: «Скарына выкарыстоўваў два календарныя стылі. У пражскіх выданнях ён ужываў студзеньскі стыль (год пачынаўся з 1 студзеня)...» Калі б гэта было так, то аўтар не папаў у халепу з датаваннем апошніх пражскіх выданняў, даказваючы, што Скарына́ ў 1519 годзе пасля кнігі «Суддзяў» (15 снежня 1519) не мог выдаць кнігі «Другі закон», «Плач Ераміі», якія чамусьці падаюцца за недатаваныя. (Даведка: кніга «Другі закон» надрукавана «По воплощении Слова Божия ... Лѣтъ Тысеща Пѧтьсотъ И Девѧтого на десеть (1519 г. — **У.А.**)», а кніга «Плач Ераміі» надрукавана «Лѣта Хр[и]ст[о]ва тысеща Пѧть сотъ и ѳі» (таксама 1519 г. — **У.А.**).) Далей «паслядоўны» аўтар робіць смехатворнае «адкрыццё», што яны і «большасць... недатаваных выданняў была надрукавана ў 1520 г.» а не ў вераснёвы год з 15.04.1519 да 31.12.1519. Рэдактары не пярэчаць лухце ў БелЭН, ЭГБ і БЭ (дзе палеатыпы выдаюцца за інкунабулы, адмысловы кніжны тэрмін «аргумент» за «калафон»).

У кан'юнктурным трактаванні факта выдання «Псалтыра» ў жніўні месяцы некаторыя даследчыкі імкнуцца прасачыць педагагічную мэтазгоднасць. Спрычынілася памылковае ўяўленне аб быццам бы пачатку «навучальнага года» з 1 верасня, а не так, як было, г.зн. 1 лістапада на дзень святых бяссрэбранікаў Касмы (Козьмы) і Даміяна (Демьяна) (Кузьмы і Дзям'яна), калі сапраўдны пачынаўся навучанне ў царкоўных школах пасля цыкла сельскагаспадарчых работ. Інерцыя мыслення натхніла на ідэалагему аб тым, што паколькі «ўсходнеславянскія народы з даўніх часоў выкарыстоўвалі «Псалтыр» як кнігу для навучання грамаце» (а чаму не ўсе хрысціяне?), то і Скарына́ «падмітусіўся» перад вераснем, каб даць дзеткам гэтую кнігу акурат да пачатку навучальнага года. Няправільна, дарэчы, інфармуецца, быццам Скарынаў пераклад «Псалтыра» змяшчае 150 псалмоў, што характэрна для Заходняга канона. У Скарыны́ ёсць у згодзе з Усходнім канонам 151 псалм, апошні з якіх — «псалмом... вънѣ числа» перакладзены з грэчаскай мовы. Яго «Псалтыр» следаванная або «Псалтыр» з паследаваннем ёсць перш за ўсё богаслужэбная кніга, якую складаюць 151 псалом, і паздзеленая на дваццаць кафізмаў, з указаннем трапароў і малітваў, што чытаюцца пасля кафізмаў; у канцы могуць змяшчацца часаслоў і месяцаслоў.

Суаднясенне дат выхаду кніг Скарыны́ з календаром эпохі звязана з інфармацыяй аб невядомых зараз, але пэўна выдадзеных палеатыпах, што істотна мяняе ўсталяваныя погляды аб іх колькасці і чарговасці з'яўлення. Сістэма канкардансу ў выданнях, дзе ўпамінаюцца параўнанні з тэкстамі кніг, якія нам яшчэ не вядомы (напрыклад, евангеллі ад «Матєея», «Марко», «Луки», «Іоана», «Апокалїпсїсъ», малых прарокаў і некананічныя «Исусъ Сираховъ» і інш.), неяк жа сведчыць, што яны былі падрыхтаваны і выдадзены, бо інакш навошта было б спасылацца на іх у канкардансах «Бівлии Рускай», задуманай як адзіны звод.

Замест энцыклапедычнай распрацоўкі храналагічнай тэматыкі, прынцыповай для разумення той альбо іншай з'явы, прыклады артыкулаў з Энцыклапедыі гісторыі Беларусі (ЭГБ) прыблізныя. Так, няма артыкулаў «Індыкт», «Індыктыён», «Календар», «Летаслічэнне», «Пасхалія», «Хронас», «Хроніка». Замест іх падаюцца артыкулы «Календары́», «Хро́нікі» ці «Хро́ніка ВКЛ» або нават «Хро́ніка ўсяго́ све́ту» з інфармацыяй не аб навуцы асэнсавання і вылічэння часу, а аб жанры выданняў, і пішуцца не прафесійнымі гісторыкамі, а філолагамі. Ці атрымае чытач уяўленне аб гэтых катэгорыях храналогіі, падкрэслім, прынцыповых для ЭГБ? Наша алюзія прызвана паказаць, што і ў скарынаznаўстве спрэс падобная палеатыўнасць і недакладнасць.

Правільнае разуменне праблемы календара, якога прытрымліваўся Скарына́, выясняе не толькі пытанне аб пачатку і чарзе яго выданняў. Прымаючы вераснёвы стыль за праяўленне «славяна-праваслаўной адасобленасці», некаторыя вучоныя рупяцца «адмазаць» доктара навук ад такога рэлікту і таму дату першага выдання — кнігі Святога Іава 10 верасня 1517 г. па вераснёвым стылі ставяць пасля выдання «Псалтыра» 6 жніўня 1517 г.

Але ж тады і Канцылярыю Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, і парыжскую Сарбону трэба папракнуць у рэтраградстве, бо яны, як і палова Еўропы, пачыналі новы год, адлік 15-гадовага Індыкту, а таксама цыкл індыктаў у Індыктыёне — з верасня. А дарэчы, прывязка падзей да календара паводле «прагрэсіўнага прынцыпу» спрычынілася да таго, што факт нараджэння будучага Народнага паэта ў перыяд летняга сонцастаяння, якое яго дзяды Іван і Ануфрый святкавалі на Купалу ў чэрвені, перанеслі на 7 ліпеня...

Такім чынам, тым, хто жыве паводле студзеньскага стылю, а мы зараз так і жывём, трэба пачатак Скарынавага кнігадрукаванья адзначаць 23 (10-га паводле ст.ст.) верасня, які пачынала «Книга сиѧ, С[вя]т[о]го Иова • С помощию бога въ троици единаго • Повѣлением Працею И Выкладомъ • Изъбранъного Мужа в лѣкарьскыхъ наукахъ Докътора Франъциска, Скорынина сына с Полоцька».

Уладзімір АГІЕВІЧ,
кандыдат філасофскіх навук

■ Віншуем пераможцаў

«Выйграюць ад гэтага ўсе!»

Менавіта так ацаніў краязнаўчую працу «Ігуменскага тракта» дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір Аляксандраў, які асабіста ўручаў шыкоўныя кніжныя падарункі пераможцам конкурсу «Мясціны, знітаваныя з душой».

Уладзімір Аляксандраў падзякаваў газеце «Звязда» за вялікую падзвіжніцкую дзейнасць, за тое, што журналісты збіраюць вакол сябе краязнаўцаў, гісторыкаў, этнографаў, ды і ўсіх, каму неабыякавая наша спадчына, што дапамагаюць іх творам дайсці да шырокага кола чытачоў. Уручаючы каштоўныя кнігі, Аляксандраў патлумачыў:

— «Струкаў. Альбом малюнкаў. 1864—1867» — гэта пазамінулае стагоддзе, наша даўніна ва ўвасабленні аўтара. Вельмі рарытэтнае выданне, карыстаецца вялікай папулярнасцю і за межамі краіны. У кнізе «Полацк. 1150» старажытны горад адлюстраваны з глыбінь стагоддзяў і да нашых дзён. Выданне атрымала Гран-пры на Маскоўскім міжнародным кніжным кірмашы.

Атрымаць каштоўныя падарункі ў рэдакцыю «Звязды»прыехалі Марыя Храмлюк з вёскі Лойкі Гродзенскай вобласці і Таццяна Грынкевіч з Баранавіч. Жанчыны былі надзвычай узрадаваны і ўсхваляваны такой увагай, казалі, што раней нічога не выйгравалі. Добрыя словы пра іх краязнаўчую працу нарэшце атрымалі матэрыяльнае ўвасабленне. Цяпер даследаваць свой край і пісаць пра яго яны будуць яшчэ з большым імпэтам, яшчэ болей знітоўваючы са сваёй душой усё, што адбываецца навокал.

Нагадаем, што конкурс працягваецца, бо не павінны спыняцца добрыя справы. Умовы чытайце ў «Ігуменскім тракце» за 10 верасня.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
(Злева направа) Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ, Таццяна ГРЫНКЕВІЧ, Марыя ХРАМЛЮК.

■ Гісторыя і лёс

РАДНЯ З ЧАТЫРОХ СТАГОДДЗЯЎ

У пошуках сэнсу жыцця ўраджэнец Ашмян стварае радавод усяго раёна

Васіль Юрша стварыў радавод сваёй сям'і: дакапаўся аж да 1650-х гадоў. Усё змясціў у сямейнай «Фамільнай кнізе», якая выйшла невялікім тыражом: на ёй напісана, што прызначаецца родным і ўсім аматарам гісторыі. Працягваючы працу над уласным радаводам, стаў вывучаць і лёсы сямей суседзяў — так і атрымалася, што Юрша даследуе генеалогію многіх родаў былога Ашмянскага павета… Ён прызнаўся, што гісторыя — гэта адзін з двух кітоў, на якіх трымаецца яго жыццё, хоць па адукацыі ён інжынер-сістэматэхнік. І сапраўды, каб заняцца вывучэннем і стварэннем радаводу, у Васіля Юршы была вельмі сур'ёзная матывацыя…

У 2000 годзе гэты чалавек перанёс складаную аперацыю. Урачы не маглі паставіць дыягназ, а ў яго адымаліся ногі, былі моцныя начныя болі. З'явіліся думкі, што надышоў час памірaць (і гэта ў 44 гады), а нічога яшчэ быцам не зрабіў… Урэшце праблему выявілі, яго прааперыравалі. У гэты ж час памёр бацька, што таксама стала моцным ударам для Васіля Юршы. Ён узгадвае:

— Мой тата вельмі імкнуўся падтрымліваць роднасныя сувязі. Калі я яшчэ быў малым, ён мяне заўсёды браў з сабой і мы ездзілі да сваякоў у вёскі. Але калі я пытаўся, што гэта за родныя, ён не мог патлумачыць — радня і радня, а якая, па кім — не ведаў.

Калі стаў папраўляцца, зразумеў, што мае патрэбу штосьці зрабіць, каб сабраць разам, сістэматызаваць усе звесткі пра сваю радню. Пачаў дасылаць лісты і працаваць у архівах:

— Спачатку даследаваў радаводы ўласнай сям'і, знайшоў вывадную справу сваіх родных у літоўскім архіве. Аказалася, яны падавалі на дваранства ў 1819 годзе. Віленскі дваранскі дэпутацкі сход прызнаў старажытнасць нашага шляхецкага роду. Аднак усе дакументы пасля гэтага ішлі ў Пецярбург на разгляд сената па герольдыі. А там у тыя часы праводзілася палітыка, накіраваная на абмежаванне колькасці шляхты. Бо ў Вялікім Княстве Літоўскім было каля 10% шляхты, а ў Расійскай Імперыі дваранства — толькі каля 2%. Матывуючы адсутнасцю на той момант уласнага фальварка, прыгонных сялян, нашай сям'і адмовілі, як і дзясяткам тысяч іншых шляхціцаў. Яны былі пераведзены спачатку ў разрад аднадворцаў, а пасля паўстання 1863 года — у разрад сялян. Памяць паступова сціралася. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўзгадваць пра сваё паходжанне было страшна і небяспечна. Людзі забыліся. Зараз, калі падысці на вуліцы да чалавека, вам яшчэ могуць назваць бабулю, дзядулю, а вось прадзядулю і прабабулю, кім яны былі,— наўрад ці.

Тады ж Юрша пачаў пісаць вершы. Ён расказвае, што мае вялізную колькасць праглядаў у інтэрнэце, піша кароткія філасофска-гумарыстычныя творы, аднак сам сябе называе «сумным клоўнам». Юрша кажа, што цяпер жыве на гэтых двух палюсах: калі стамляецца ад гісторыі, пераходзіць на паэзію, калі стамляецца ад паэзіі, пераходзіць да гісторыі (хаця мае ён і ўласны бізнес). «Гэтыя дзве батарэйкі мяне і сілкуюць», — кажа ён і вяртаецца да аповеду пра свой радавод:

— Па дакументах я высветліў, што ў 1650-х гадах мой прапрапра…

дзед Ян Сымон Скірмант-Юрша за слаўныя дзеянні атрымаў зямлю ў Ашмянскім павеце і «пабудаваў фартэцыю (крэпасць), Юршаны званую». Відавочна, што назва Юршаны ўтворана ад прозвішча Юрша. Гэта як Гольша — Гальшаны, Лукша — Лукшаны, Рукша — Рукшаны — існавала такая традыцыя, калі большасць вёсак называлі па прозвішчы ўладальнікаў ці заснавальнікаў. У 1800-х гадах мае продкі пераехалі пад Салечнікі Віленскага павета. Праз 30 год яны вярнуліся, аднак Юршаны засталіся па лініі іншага родзіча, у якога былі толькі дочкі,— прозвішча змянілася. А мае продкі, вярнуўшыся, сталі жыць у суседняй вёсцы. З памяці сцёрлася, чаму Юршаны маюць такую назву. Сёння ў гэтай вёсцы толькі два дамы. Калі прыязджаеш туды, пытаешся, чаму Юршаны,— ніхто не ведае. І толькі з дакументаў вынікае, калі і чаму ўсё пачалося.

Займацца гэтымі даследаваннямі Васіль Юршу было надзвычай цікава, бо ён адшукаў некаторыя судовыя матэрыялы. У мінскім архіве на вуліцы Крапоткіна захаваліся дакументы ашмянскіх судоў — гарадскога і земскага. Дзякуючы ім удалося развеяць некаторыя гістарычныя міфы, зразумець, чым сапраўды жылі людзі ў тыя або іншыя часы. У архівах вельмі шмат інфармацыі, бо шляхта варагавала, сварылася, часта мела зямельныя спрэчкі. І ўсе гэтыя сведчанні даволі добра захаваліся, нягледзячы на тое, што ў 1830-я гады ў Ашмянах быў пажар і частка архіва загінула. Аднак існуюць ускосныя рэестры, у якіх змяшчаюцца згадкі пра пэўныя справы, што маглі знікнуць.

Ёсць чалавек, які з'яўляецца для Юршы вялікім аўтарытэтам,— гэта Чэслаў Янкоўскі. Ён нарадзіўся на 100 гадоў раней за яго, у 1856 годзе, і жыў у Палянах пад Ашмянамі. Янкоўскі стварыў 4-томную кнігу «Ашмянскі павет». Падчас працы над ёй аўтар ездзіў па вёсках, сустракаўся з уладальнікамі маёнткаў, даследаваў іх асабістыя архівы, выпісваў гісторыю роду. Пасля шматлікіх войнаў — Першай сусветнай, Грамадзянскай, Другой сусветнай — многія архівы загінулі, а ўсё, што было сабрана і выдадзена ў кнізе, засталося. Таму праца Янкоўскага з'яўляецца прызнанай гістарычнай крыніцай. Гэта кніга натхніла Юршу на асабістыя пошукі. Ён тлумачыць, чаму выбар, куды прыкласці свае намаганні, паў менавіта на генеалогію:

— Мяне хваляваў сэнс жыцця. Мне было незразумела, напрыклад, чаму паміраюць малыя або нянароджаныя дзеці, чаму сыходзяць добрыя людзі. Бо, калі ў іншы свет заўчасна адпраўляецца пэўны злодзей, можна думаць, што хтосьці яго пакараў. І каб зразумець сэнс жыцця, я паспрабаваў знайсці адказ, займаючыся гісторыяй родаў. Часта падавалася, што набліжаешся да яе — вось-вось — адгадка блізка. Аднак яна ўвесь час некуды сплывала… Як матэматык, я паспрабаваў падысці да вялікіх лічбаў — не на прыкладзе аднаго жыцця спрабаваць зразумець «Для чаго ён?» (гэта вельмі складана),— а прааналізаваць сотні і тысячы біяграфій. Я размаўляў са знакамітымі, старымі людзьмі, каб даведацца, што яны пра гэта думаюць. Аказалася, многія нічога не думаюць, проста жывуць, не ставячы перад сабой задачы адказаць на такое пытанне. Многія кажуць, што жывуць дзеля дзяцей. Калі пытаешся: «А дзеці навошта?» — адказваюць, што дзеці — дзеля сваіх дзяцей. Атрымліваецца, пытанне проста адкладваецца на пасля… Узнікала такое рашэнне: хтосьці з гэтага ланцужка «выстраліць». Як Аляксандр Македонскі, як Чэслаў Янкоўскі,— да іх і пасля іх усе былі звычайнымі, а яны здолелі зрабіць моцны прарыў…

Другое, што мяне хвалявала: усе надзвычай шмат ведаюць пра знакамітых людзей і нічога не ведаюць пра простых. Праходзіць час, і людзі абсалютна сціраюцца з памяці і гісторыі, нават на могілках слядоў не застаецца. Дык няўжо яны былі не патрэбны?! Я ўнутрана пратэставаў супраць гэтага. Працуючы і збіраючы інфармацыю ў архівах, я спрабаваў вярнуць памяць пра кожнага. Калі я пра іх штосьці ведаю, значыць, ужо аднаму чалавеку яны патрэбныя. Калі яшчэ хтосьці прачытае — некалькі будзе іх ведаць і яны не знікнуць бясследна.

Працуючы з архівамі, Юрша ўбачыў, што сямейныя спрэчкі былі заўсёды. Нават родныя браты і сёстры часта судзіліся паміж сабой. Напрыклад, бацька адпісаў дочкам пасаг, а сыну фальварак, які і павінен быў выплаціць усё пасля яго смерці. Аднак маглі здарыцца пэўныя цяжкасці (напрыклад, неўраджай) і брат не мог аддаць усяго ў тыя тэрміны, якія хацелася сёстрам. Узнікала такая спрэчка, яны выклікалі роднага чалавека ў суд пазывам. Дарэчы, пазывы раней былі вельмі распаўсюджанымі — гэта абазначае, што на чалавека падавалі скаргу, пасля якой ён рабіў усё магчымае, каб неяк улагодзіць сварку і не давесці справу да суда. І сапраўды, спрэчкі пасля пазыву часта вырашаліся мірам.

Васіль Юрша адзначыў, што, займаючыся генеалогіяй, немагчыма не вывучаць гербы. Ён нават пачаў ствараць уласную калекцыю. Спачатку сваімі рукамі, пасля з дапамогай тэрмадруку ён вырабіў каля 50 гербоў. Цяпер атрымлівае асалоду ад іх выяў у сваёй кватэры. Але імкнецца знаёміць з імі і грамадскасць. Часам выстаўляе калекцыю ў Ашмянскім музеі, у мясцовых школах, ездзіць на фестывалі сярэднявечнай культуры, але, заўважае Васіль Юрша, хоць публіка на такіх сустрэчах падрыхтаваная, не вельмі шмат людзей разумее, што гэта і для чаго, — і яшчэ менш ведае свой герб.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, фота аўтара.
Ашмянскі раён

P. S. ***У наступным выпуску «Ігуменскага тракта» чытайце пра тое, як Васілю Юршу ўдалося адшукаць 7 невядомых раней кален роду Ф. Багушэвіча***

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта, земельный участок, на котором расположен объект, обременения третьими лицами	**Капитальное строение, инв. № 420/С-4687** (Назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – одноэтажное кирпичное здание отдела обезвреживания стоков), площадью 133,4 кв.м, с прилегающими к нему сооружениями: - водопроводная сеть 79,32 м; - площадка (бетонные плиты) площадью 2191,1 кв.м; - борт дорожный протяженностью 259,5 м.п., - Канализационная внутридворовая ливневая сеть (асбоцементная) протяженностью 27,67 м; - Сеть фекальной канализации протяженностью 207,25 м. Адрес расположения: Лидский район, Третьяковский с/с, 45 здание отдела обезвреживания стоков в районе д. Островля. Капитальное строение, инв. № 420/С-4687, расположено на земельном участке, кадастровый № 423685400030000075, площадью 0,9860 га, расположенном по адресу: Лидский район, Третьяковский с/с, 45, здание отдела обезвреживания стоков в районе д. Островля. Обременение третьими лицами – сдается в аренду помещение, площадью 68,9 кв.м, сроком до 31.12.2013 г. **Капитальное строение, инв. № 420/С-42258** (Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад минеральных удобрений) площадью 184,8 кв.м, с прилегающими к нему сооружениями: - площадка асфальто-бетонная площадка 532 м.кв; - борт дорожный 65 м.п.; - подземная кабельная линия, протяженностью 11,66 м. Адрес расположения: Лидский район, Третьяковский с/с, 2, склад минеральных удобрений в районе д. Островля. Капитальное строение, инв. № 420/С-4687, расположено на земельном участке, кадастровый № 423685400030000076, площадью 0,5350 га, расположенном по адресу: Лидский район, Третьяковский с/с, 2 склад минеральных удобрений в районе д. Островля.
Начальная цена продажи	456 020 449 (четыреста пятьдесят шесть миллионов двадцать тысяч четыреста сорок девять) рублей **без учета НДС**
Сумма задатка	45 602 045 (сорок пять миллионов шестьсот две тысячи сорок пять) белорусских рублей
ЛОТ 2	
